

ШТО ТРЭБА ПАСПЕЦЬ ДА КАЛЯД 6

«ГУЧЫ» З КУЧЫ 13



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

22 СНЕЖНЯ 2022 г. ЧАЦВЕР № 251 (29873)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Андрэй ЛАБОВІЧ, намеснік старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю:**

*«Стан спажывецкага рынку знаходзіцца пад пільнай увагай Камітэта дзяржаўнага кантролю, асабліва пасля прыняцця Дырэктывы № 10 «Аб недапушчальнасці росту цэн» і пастановы ўрада № 713 «Аб сістэме рэгулявання цэн». Мы зрабілі акцэнт на кантролі за выкананнем уведзеных абмежаванняў па ўзроўні цэн. Большасць суб'ектаў гаспадарання выконвае заканадаўства, прынятыя нарматыўныя прававыя акты. Але выяўляюцца асобныя факты перавышэння гандлёвых надбавак, іншыя парушэнні, у тым ліку санітарна-эпідэмічных нормаў. Пратэрмінаваная прадукцыя аператыўна адбіраецца па патрабаванні кантралёраў, наводзіцца парадак. Таксама хочам звярнуць увагу на неабходнасць насычэння гандлёвых паліц разнастайным асартыментам, які карыстаецца попытам напярэдадні калядных і навагодніх свят».*

# А вы ўжо купілі ёлку?



Фота БелТА.

**Па ўсёй краіне ў вялікіх і меншых гарадах пачалі працаваць ёлачныя кірмашы. Самы час завітаць на іх, выбраць сабе зялёную прыгажуню, якая напоўніць дом чароўным водарам і верне ўспамінамі ў дзяцінства, калі быў бесклапотным і шчаслівым, як гэтыя малыя брастаўчане.**

Эканамікс

## СТАБІЛІЗАТАР НАШАЙ ЭКАНОМІКІ

**Віцэ-прэм'ер Леанід ЗАЯЦ — аб выніках работы і перспектывах АПК**

**На сумесным пасяджэнні дзвюх палат парламента намеснік прэм'ер-міністра расказаў аб развіцці айчыннага аграпрамысловага комплексу — аднаго з бясспрэчных флагманаў нашай эканомікі. У сельскай мясцовасці пражывае 22 % насельніцтва краіны, у сельскай гаспадарцы працуе звыш 7 % ад занятых у рэальным сектары эканомікі.**

СТАР. 2



Фота БелТА.

Перадсвяточнае

## КОЛЬКІ КАШТУЕ СУСТРЭЦЬ НОВЫ ГОД У САНАТОРЫІ?

**Сустрэча Новага года ў беларускім санаторыі традыцыйна карыстаецца попытам. Святочная вячэра са стравамі ад шэф-кухараў, канцэрт зорак беларускай эстрады, Дзед Мароз і Снягурка з конкурсамі і гульнямі і танцы да самай раніцы — такія праграмы прапануюць здраўніцы ў навагоднюю ноч. Іншыя дні будуць насычаны мерапрыемствамі на адкрытым паветры: зімовыя гулянні, спаборніцтвы і экскурсіі. І, безумоўна, медыцынскія і СПА-працэдуры, якія дазволяць парэлаксаваць. У большасці санаторыяў месцы на навагоднія святы цалкам забраніраваны. Адзін дзень у беларускім санаторыі ў гэты час у сярэднім абыдзецца ў 93 рублі, навагодні банкет — да 200 рублёў.**

### НАВАГОДНІ БАНКЕТ, ЗІМОВЫЯ ГУЛЯННІ І СПА-ПРАГРАМЫ

Як адзначае **дырэктар Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва Генадзь БАЛБАТОЎСКІ,** Новы год у айчынных санаторыях традыцыйна карыстаецца павышаным попытам. Усе здраўніцы будуць цалкам запоўненыя. У перыяд навагодніх свят тут чакаюць каля 22 тысяч гасцей. Адметна, што амаль палова з іх (больш за 10 тысяч) — замежныя грамадзяне, пераважна расіяне.

Як правіла, на гэты час санаторыі арганізоўваюць двухтыднёвыя туры, якія будуць праходзіць з 25 снежня да 7 студзеня. Заезды будуць практычна паўсюль у адзін і той жа час.

СТАР. 3

## КОРАТКА

- **Прэзідэнт Беларусі падтрымаў прапанову аб падаўжэнні на 2023 год бязвізу для жыхароў Літвы, Латвіі і Польшчы.**
- Першым касманаўтам ад Беларусі будзе дзяўчына.
- **Конкурс чытальнікаў правялі ў Баку ў гонар 140-годдзя Янкі Купалы і Якуба Коласа.**
- Установы адукацыі правядуць для школьнікаў экскурсіі і выставы на канікулах.

ISSN 1990 — 763X

**Кожны дзень – з любімай «Звяздой»!**

**Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2023 г., — у падарунак чатыры календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.**



**Наталля КАЧАНАВА:**

# У СУЧАСНЫМ СВЕЦЕ РОЛЯ ПАРЛАМЕНТАРЫЯЎ КРАТНА ЎЗРАСТАЕ

**Пад кіраўніцтвам Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі Качанавай адбылося чарговае пасяджэнне экспертнага савета. На парадак дня вынесены два законапраекты аб змяненні законаў Рэспублікі Беларусь — «Аб Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь» і «Аб статусе дэпутата Палаты прадстаўнікоў, члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь».**

Адкрываючы пасяджэнне, Наталля Качанава падкрэсліла, што для эфектыўнай работы парламенцкага корпуса неабходна актуальная і запатрабаваная на практыцы прававая база. Асноўныя законы, якія рэгулююць дзейнасць Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і ўстанаўліваюць статус дэпутата Палаты прадстаўнікоў, члена Савета Рэспублікі, павінны дазваляць парламентарыям, роля якіх у сучасных рэаліях кратна ўзрастае, эфектыўна ажыццяўляць іх дзейнасць.

Як адзначыла Наталля Качанава, сёння парламенцкі корпус з'яўляецца рэальнай і аўтарытэтнай грамадска-палітычнай сілай, якая праводзіць практычную работу па абароне нацыянальных інтарэсаў дзяржавы. У многім ад эфектыўнасці дзейнасці Савета Рэспублікі, Палаты прадстаўнікоў, мясцовых Саветаў дэпутатаў залежыць далейшае развіццё нашай краіны як суверэннай дзяржавы.

«У цяперашніх геапалітычных умовах, калі ўзмацняецца супрацьстаянне сусветных цэнтраў сілы і па сутнасці сітуацыя ўжо перарастае ў маштабны сістэмны крызіс, такім адносна невялікім дзяржавам, як Беларусь, зусім няпроста захаваць свае суверэнітэт і незалежнасць, — падкрэсліла спікер верхняй палаты парламента. — Наш Прэзідэнт, глыбокапаважаны Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка, дакладна вызначыў дэвіз, пад якім пройдзе беларускае старшынства ў АДКБ, — «Праз салідарнасць і супрацоўніцтва да міру і бяспекі». Задача парламентарыяў — накіраваць сваю міжнародную дзейнасць на ажыццяўленне гэтай ідэі. Мы павінны рабіць усё магчымае і нават немагчымае для арганізацыі дыялогу ў імя міру, агульных бяспекі і развіцця».

Старшыня Савета Рэспублікі звярнула ўвагу на тое, што міжнародная дзейнасць парламентарыяў як ніколі павінна быць актыўнай і прыносіць карысць краіне. «Важна прымаць дзейсныя меры па пашырэнні ўплыву Рэспублікі Беларусь у рэгіянальных аб'яднаннях, дабівацца палітычнай падтрымкі ад дзяржаў-партнёраў, устанаўліваць канструктыўныя сувязі з калегамі з іншых краін, садзейнічаць супрацоўніцтву прадстаўнічых і заканадаўчых органаў», — сказала яна.

Неабходна выкарыстоўваць розныя пляцоўкі для давядзення міжнароднай супольнасці дакладнай пазіцыі аб непрымальнасці дэстабілізацыі сітуацыі, аб мірных, аб'яднальных намаганнях Беларусі. «Наш голас павінен гучаць так, каб нас чулі. Нам ёсць што сказаць», — заявіла Наталля Качанава.

Яна адзначыла, што дзейсным інструментам абароны нацыянальных інтарэсаў Рэспублікі Беларусь, забеспячэння грамадскага парадку і бяспекі нашых грамадзян служыць заканатворчасць. Пры дапамозе законаў вырашаюцца многія актуальныя пытанні палітычнага, эканамічнага, сацыяльнага і культурнага развіцця нашай краіны.

«У нарматворчай дзейнасці дасягнута высокая планка, якую мы абавязаны вытрымліваць. Нам, парламентарыям, працаваць трэба хутка, дакладна і высокапрафесійна. Да падрыхтоўкі законапраектаў трэба падыходзіць аналітычна, выкарыстоўваць шырокі інструментарый выяўлення і ўліку грамадскай думкі, экспертных ацэнак, каб навацыі, якія прымаюцца, былі дасканала выверанымі, эфектыўнымі, а галоўнае — справядлівымі», — расставіла акцэнты Старшыня Савета Рэспублікі.

Не менш важная роля парламенцкага корпуса ў забеспячэнні эканамічнага дабрабыту нашай краіны. Парламентарыі разам з усёй кіраўніцкай вертыкаллю абавязаны працаваць з поўнай самааддачай, практычна ў мабілізацыйным рэжыме. Размова ідзе аб непасрэдным устанаўленні кантактаў, пошуку новых дзелавых партнёраў і перспектыўных ніш для эканамічнага супрацоўніцтва.

Актуальнае ажыццяўленне парламенцкага кантролю за выкананнем рашэнняў VI Усебеларускага народнага сходу і Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2021 — 2025 гады. Самую сур'ёзную ўвагу трэба ўдзяляць рэалізацыі бюджэтнага пакета і заканадаўства эканамічнага блока. «Гэта ў тым ліку і нашы абавязацельствы перад народам», — падкрэсліла спікер.

Спынілася Наталля Качанава і на рабоце з насельніцтвам як на адным з найважнейшых кірункаў дзейнасці парламентарыяў. «Наша задача — трымаць руку на пульсе падзей, быць у курсе запытаў выбаршчыкаў, ведаць, што іх хвалюе. Унікаючы ў настрой людзей і прагназуючы сітуацыю на падведамаснай тэрыторыі, мы павінны спрыяць прыняццю вывераных і запатрабаваных кіраўніцкіх рашэнняў», — сказала яна, дадаўшы, што пры гэтым работа парламентарыяў з насельніцтвам не павінна быць фармальнай. Бо людзі гэта тонка адчуваюць.

«Акрамя таго, нельга забывацца, што за намі ідуць маладыя калегі — члены Маладзёжнага савета. Наша супрацоўніцтва ўзаемадапаўняльнае: яны вучацца ў нас, а мы ўважліва ставімся да іх прапаноў і ініцыятыў. Настаўніцтва — гэта вельмі важная місія, якая патрабуе нямала сіл, мудрасці і цярпення», — вызначыла яшчэ адзін важны напрамак работы Наталля Качанава. Паводле яе слоў, парламентарыі адказныя за выхаванне маладога пакалення і беларускага грамадства ў цэлым. «Шмат у чым ад нас залежыць тое, як развіваюцца грамадскія арганізацыі, палітычныя партыі, грамадзянскія ініцыятывы, як складваюцца ўзаемаадносіны паміж прадстаўнікамі розных канфесій і нацыянальнасцяў, як людзі ў нашай краіне ставяцца адзін да аднаго», — дадала спікер.

«Сёння няма пытанняў не нашых, — падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі. — Мы — народныя абраннікі, таму павінны рабіць усё, што трэба нашым людзям. Неабходна прымаць рашэнні і браць на сябе адказнасць за іх рэалізацыю, каб дзяржаўная палітыка, накіраваная перш за ўсё на дабрабыт нашых грамадзян, увасаблялася ў жыццё. І паверце, патрабаванні да работы парламентарыяў будуць толькі ўзрастаць».

На думку Наталлі Качанавай, быць парламентарыем — гэта не проста насіць значок на грудзях: «Гэта значыць цалкам прысвяціць сябе гэтай справе, выбраць сваім жыццёвым пакліканнем служэнне беларускаму народу і нашай краіне. Усе, хто сёння ў складзе парламента, мясцовых Саветаў дэпутатаў ці ў перспектыве будзе абраны народным прадстаўніком, павінны гэта дакладна разумець і працаваць менавіта так».

❍ Дарэчы

# «ПРАВЕДЗЕНА КОМПЛЕКСНАЯ І СІСТЭМНАЯ РАБОТА»

Падчас пасяджэння дзясятай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу сёмага склікання сенатары адобрылі шэраг законапраектаў.

Як адзначыў старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргей Сівец, 15 сакавіка бягучага года ўступілі ў сілу прынятыя на рэспубліканскім рэферэндуме змяненні і дапаўненні ў Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь:

— Фактычна з гэтага моманту быў дадзены старт маштабнай рабоце па прывядзенні ў адпаведнасць ключавых законаў нашай краіны з тымі канстытуцыйнымі навацыямі. Кажучы аб унясенні змяненняў у законапраекты «Аб Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь» і «Аб статусе дэпутата Палаты прадстаўнікоў, члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь», неабходна адзначыць, што змяненні ў першую чаргу датычацца прывядзення іх у адпаведнасць з абноўленай Канстытуцыяй. Акрамя таго, шэраг палажэнняў уносіцца ў адпаведнасць з праваапрымяняльнай практыкай, якая была назапашана з моманту прыняцця дадзеных заканадаўчых актаў.

Сяргей Сівец падкрэсліў, што шэраг палажэнняў звязаны з развіццём заканатворчай работы і заканадаўчых працэсаў:

— Сур'ёзна змяняюцца кантрольныя паўнамоцтвы дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і членаў Савета Рэспублікі. Акрамя таго, прадстаўнікі выканаўчай галіны ўлады будуць выступаць са штогадовымі справаздачамі перад парламентарыямі па сферы сваёй дзейнасці, а таксама з дасягнутымі вынікамі. Сур'ёзна ўзмоцніцца вектар работы парламентарыяў з насельніцтвам, у тым ліку з прыцягненнем прадстаўнікоў мясцовай улады. У сувязі з гэтым была праведзена сістэмная і комплексная работа: мяркую, што нам удалося ўлічыць усе неабходныя пытанні, якія трэба было ўрэгуляваць на ўзроўні гэтых двух ключавых праектаў закона, — рэзюмаваў сенатар.

**Арына КАРПОВІЧ.**

*Больш падрабязна аб пытаннях, разгледжаных на сесіі, — у наступным нумары «Мясцовага самакіравання».*

Па сутнасці

# Пераможная праўда



Кажуць, што беларусы сціплыя, мяккія, лагодныя і добразычлівыя. Так здаецца. На дробязі не рэагуем — кашулю на сабе не рвём. Але мы не падатлівыя. Таму калі з нас наўмысна спрабавалі вылепіць талерантную нацыю (а цяпер гэта слова больш ужо з адмоўным сэнсам), мы адчулі. І калі нас восемдзясят гадоў таму спрабавалі ператварыць у зручны матэрыял для эканомікі чарговага рэйха — мы тое адчулі, ды так, што нават руіны пачалі страляць. Так адказалі, што шыбы ў СД, гестапа і палявой паліцыі задрыжэлі, а ў іх рэйхс- і менш значных «фюрараў» паджылкі затрэсліся.

Землетрасенне сёння адбываецца і ў геапалітыцы. Нібыта з нор і лежбішчаў на паверхню павыпаўзалі розныя дзіўныя і дзікунскія істоты. І зноў гарыць вогнішча нацызму. Савецкі класічны кінематограф выканаў прарочую справу. Вуснамі генія Бранявога (дакладней, аднаго з галоўных фашыстаў Мюлера) у «17 імгненнях вясны» прадказаў будучыню Еўропы: «Як толькі дзе-небудзь замест слова «добры дзень» вымаўяць «хайль» у нечы персанальны адрас, ведайце: там нас чакаюць, адтуль мы пачнём сваё вялікае адраджэнне».

Пачалі. Павылазілі з бандэраўскіх сутарэнняў, з нутра злапомных жыхароў Галічыны. Добрую хованку знайшлі. На кніжных паліцах бібліятэк, на кафедрах гуманістычных навук, у навуковых лабараторыях. Нацызм — гэта у першую чаргу не палітычная ідэалогія, гэта стан душы, атаясамленне сябе з абранай часткай грамадства. Гэта «неверагоднасць» светапогляду: я ведаю, як усім трэба. Нас, беларусаў, спонсары нацызму таксама спрабавалі скарыстаць на штучныя зубы штучнай заходняй усмешкі. Спрабавалі часта. Не атрымалася. Смярдзіць нацызм: для нас — жахам Хатыні, Трасцянца, Краснага Берага. Для часткі грамадства ў паўднёвага суседа — відаць, не. У геннай памяці ажылі рабаўніцтва, гвалт і забойства. Унукі і праўнукі дывізіі СС «Галічына» пайшлі па крывых слядах. Спачатку з факельным шэсцем па Кіеве, пасля вогненнай экспедыцыяй у Адэсе, затым трацілавым фронтам на Данбас. А ўсё пачалося з вогнішчаў Майдана. Відаць, хтосьці добра пагрэў на іх рукі. Не было волі і жадання спыніць марш нацызму. У Беларусі атрымалася. Ва Украіне — не. Не было каму. Лідара не было.

Навошта рэінкарнуюць нацызм? Няўжо не было майданэкаў, крэматорыяў, жоўтых зорак на дзіцячых сукенках — каб лепш цэліцца ў сэрца. Так магла падмануцца цэлая нацыя. Нацыя інтэлігентаў і аматараў Шылера. Падмануцца пасля піўнога путчу. Цвярозасць прынеслі «варвары» з усходу. Але зноў еўрапейцы лезуць у тую ж пастку. Напэўна, трэба гэта тым, у каго ненажэрная вантроба да чужых багаццяў. Ну так — распалі нянавісць паміж братамі і карыстайся іх уласнасцю. З Украінай атрымалася. З Беларуссю не выйшла.

Зараз скажуць: ізноў пра вайну. Так. А інакш не растлумачыш. Трэба ж усведамляць і разумець. Пасля страшэннай акупацыі ад Беларусі ў вёсках засталіся коміны (вось чаму мы не такія багатыя, як нацы-акупанты), у гарадах — гета, а ад сталічнай культуры — апаленыя сцены Опернага. Пра людзей я і не кажу. Лічбы. Жахлівая. Пакаленне 1922–1924 гадоў. У жывых застаўся кожны трэці. Гэта па Саюзе. У цэлым па краіне. А калі па рэгіёнах згадаць? Некаторыя ўдзельнікі камісіі па генацыдзе літаральна сівеюць. Ад фактаў, ад пачутага, ад знойдзенага.

З чыгуначнага вакзала Мінска былі відаць нават гарадскія ўскраіны. А з трыбуны ААН — спаленыя хаты, вырваныя з беларускай глебы з каранямі цэлыя сем'і. Партызаны Палесся і Расоншчыны, падпольшчыкі Мінска і Брэста. Памятайце і ганарыцеся, беларусы, мы заснавальнікі ААН. Абы не было вайны. Такі просты міжнародны пасыл. З яго больш не смяюцца. Ні кампрадоры з найбліжэйшых краін, ні свае роднenькія — касмапаліты. Не да смеху. На маршы — нацызм. Яму старанна сцелюць чырвоныя ад крыві загінулых дываны. Пад абцасы кідаюць кветкі — сімвал загубленых дзіцячых жыццяў. Украінскі нацызм выйшаў не з гушчароў львоўскіх лясоў, ён выпешчаны і ўзгадаваны ў светлых кабінетах самых вядомых вуліц свету.

«Не» нацызму — з трыбуны ААН сказалі мы разам з тымі, з кім бралі Берлін. ААН і заснавана пераможцамі нацызму. Падтрымалі краіны, якія з ім не сутыкаліся. А прагаласавалі супраць рэзалюцыі аб недапушчальнасці яго гераізацыі ЗША, Украіна, Польшча, дзяржаўныя ўтварэнні ў акваторыі Балтыкі. Такіх назбіралася ажно за паўсотню. Мяне не здзіўляе гэтая лічба. Памятаеце, з прадстаўнікамі колькіх еўрапейскіх краін ваявалі нашы дзядулі-франтавікі? Разам на баку Зяленскага такая ж колькасць. Мяне не здзіўляе. Усё зразумела з фармулёўкі. Рэзалюцыя, у прыватнасці, заклікае прыняць меры, каб не дапусціць «перагляду вынікаў Другой сусветнай вайны і адмаўлення злачынстваў супраць чалавечнасці і ваенных злачынстваў». Мы разумеем, як ім, нашчадкам вайскоўцаў адукаванай Еўропы, хацелася хутчэй пра ўсе свае памылкі забыць. І пра інквізіцыю, і пра прымусовае хрышчэнне, і пра каланізацыю Афрыкі і Азіі, і пра рынак скальпаў індзейцаў, і пра калабарацыю вытанчанай Францыі з Гітлерам, і пра чалавечыя заапаркі ў фанабэрыстай Бельгіі. Пра іх ганебную вечную вайну з намі. Адкупіцца ад гісторыі — індульгенцыя таксама была ў гэтай самай гісторыі Старога Свету. Забыцца, каб ізноў рушыць на ўсход. Сад патрабуе ўгнаення.

Але свет падтрымаў нашы прапановы. Свет з намі. Свет чуў і памятае прамовы Прэзідэнта Лукашэнкі і на плошчы Перамогі, і на саміце ШАС. Свет ведае, што ў гэтых словах праўда. А яшчэ я ведаю, што ўсе, хто стварыў гэтую рэзалюцыю, хто яе агучыў, могуць спакойна глядзець на партрэты сваіх продкаў-франтавікоў, заглядаць у вочы герояў з кінахронікі. І памятаць, і нагадваць бяспамятлівым, як штандары «пераможнай» нацысцкай арды былі кінутыя пад сцены Крамля.

**Яўген ПУСТАВОЙ.**

# СТАБІЛІЗАТАР НАШАЙ ЭКАНОМІКІ

## НА КОЖНАГА БЕЛАРУСА — ПА 98 КГ МЯСА І 237 ЛІТРАЎ МАЛАКА

Расказваючы аб апошніх дасягненнях аграпрамысловага комплексу, Леанід Заяц звярнуў увагу на тое, што істотна абнавілася вытворчая база. «Толькі за мінулую пяцігодку ў краіне пабудаваны і рэканструяваны 472 малочнатаварныя фермы, уведзены ў эксплуатацыю 12 новых свінагадоўчых комплексаў, якія працуюць па самых сучасных тэхналогіях, вытворчыя паказчыкі на якіх фактычна не ўступаюць сусветным, — удакладніў ён. — Акрамя таго, праведзена аднаўленне 22 свінагадоўчых комплексаў, пабудаваны і рэканструяваны 32 птушкафабрыкі». «Тэхнічная аснашчанасць сельскагаспадарчых арганізацый дала магчымасць праводзіць увесь комплекс палявых работ у агратэхнічныя тэрміны», — адзначыў намеснік кіраўніка ўрада.

Статыстыка сведчыць: у сярэднім на аднаго беларуса за год выпускаецца 98 кілаграмаў мяса, 237 кілаграмаў малака, 95 кілаграмаў садавіны, 170 кілаграмаў гародніны, 159 кілаграмаў бульбы і каля 40 кілаграмаў цукру, 18 кілаграмаў алею, 77 кілаграмаў хлебапрадуктаў — гэта вышэй паказчыкаў на душу насельніцтва ў многіх іншых краінах. Пры разліку на аднаго чалавека выходзіць 3200 кілакалорый за суткі, што поўнасцю выключае верагоднасць голаду або недаядання.

Як акцэнтаваў увагу Леанід Заяц, станоўчыя тэндэнцыі развіцця аграрнай галіны захоўваюцца і сёлета. За 11 месяцаў 2022 года тэмп вытворчасці валавой прадукцыі сельскай гаспадаркі ў гаспадарках склаў 103,5 %. Па яго словах, па выніках года чакаецца захаванне атрыманага выніку.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Дзеля дзяржаўных патрэб у поўным аб'ёме пастаўлена харчовае збожжа (817,8 тысячы тон) і 82 тысячы тон алейнага семя рапсу, — заўважыў віцэ-прэм'ер. — Названыя аб'ёмы нарыхтаванага збожжа даюць магчымасць забяспечыць унутраны рынак іржаной і пшанічнай мукой, а таксама ячменнымі, грачанымі і аўсянымі крупамі ў поўным аб'ёме да ўраджаю 2023 года».

Паводле яго слоў, станоўчая дынаміка назіраецца і ў фінансавых выніках: «Адзначаецца рост прыбытку ад рэалізацыі прадукцыі на 73 % (атрымана 1,6 млрд рублёў). На 50 % павялічыўся чысты прыбытак (2,1 млрд рублёў). Рэнтабельнасць продажаў забяспечана на ўзроўні 9,7 %, супраць 6,9 % у студзені — кастрычніку 2021 года».

Рост сельскагаспадарчай вытворчасці садзейнічае павелічэнню вытворчасці ў краіне асноўных прадуктаў харчавання: масла, сыроў, тварагу і тварожных вырабаў, малака сухога абястлушчанага, ялавічыны, мяса птушкі і інш.

## ЭКСПАРТНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ РАСЦЕ

Тое, што беларуская прадукцыя карыстаецца попытам за мяжой, пацвярджаюць сусветныя рэйтынгі. Рэспубліка Беларусь уваходзіць у першую пяцёрку краін — экспарцёраў малакапрадуктаў і ТОП-15 краін вядучых экспарцёраў мясной прадукцыі.

— Доля экспарту харчовых тавараў і сельскагаспадарчай сыравіны ў агульным экспарце Рэспублікі Беларусь складае каля 20 %, у пачатку 2000-х гадоў гэты паказчык складаў каля 7 %, — заўважыў Леанід Заяц. — За 10 месяцаў бягучага года мы ўжо перавысілі гадавы паказчык 2021 года, аб'ём экспарту склаў 6,8 млрд долараў ЗША, або амаль 126 % да ўзроўню аналагічнага перыяду мінулага года. Па выніках 2022 года чакаецца экспартная выручка больш за 8 млрд долараў ЗША ў эквіваленце. Рост экспарту абумоўлены пераважна за кошт спрыяльнай цэнавой кан'юнктуры на знешніх рынках па большасці таварных пазіцый, а таксама росту натуральных паказчыкаў экспарту.

Ва ўмовах санкцыйнай палітыкі ў адносінах да Беларусі нашы прадпрыемствы вядуць работу па пашырэнні паставак на традыцыйныя рынкі (краіны СНД), а таксама па пераарыентацыі на новыя рынкі збыту, прапрацоўваюць новыя лагістычныя маршруты ў краіны далёкага замежжа. Як расказаў віцэ-прэм'ер, сёння геаграфія экспарту харчовых тавараў і сельскагаспадарчай сыравіны налічвае каля 100 краін свету. Асноўная доля ў экспарце харчавання прыпадае на Расійскую Федэрацыю. Адныя з галоўных пакупнікоў беларускай харчовай прадукцыі таксама выступаюць і краіны Азіі.

## ПА ДЗЕСЯЦЬ МАЛОЧНАТАВАРНЫХ КОМПЛЕКСАЎ — У КОЖНАЙ ВОБЛАСЦІ

Гаворачы аб далейшым развіцці аграпрамысловага комплексу, Леанід Заяц звярнуў увагу на тое, што асноўным рэзервам росту ў раслінаводстве застаецца строгае выкананне рэгламентаў тэхналагічных патрабаванняў вытворчасці сельскагаспадарчых культур, заснаванае на поўным іх забеспячэнні мінеральнымі і арганічнымі ўгнаеннямі, прымяненні інтэграванай комплекснай аховы раслін, пасеве якасным насеннем высокіх рэпрадукцый у аптымальныя агратэхнічныя тэрміны, а таксама своечасовай і без страт уборкі.

> Асновай сельскай гаспадаркі з'яўляецца буйная таварная вытворчасць, на долю якой прыпадае больш за 80 % валавой прадукцыі, каля 17 % прадукцыі забяспечваюць асабістыя падсобныя гаспадаркі грамадзян, 3 % — сялянскія (фермерскія) гаспадаркі. Па памеры сельскагаспадарчых угоддзяў на душу насельніцтва Беларусь уваходзіць у дваццатку сусветных лідараў.

Адным з істотных рэзерваў росту прадукцыі раслінаводства з'яўляецца эфектыўнае выкарыстанне меліяраваных земляў, на долю якіх прыпадае 38 % сельскагаспадарчых зямель грамадскага сектара. Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь у чэрвені бягучага года пастаўлена задача па павелічэнні аб'ёмаў меліярацыйных работ не менш як у два разы адносна 2021 года. «У рамках гэтага даручэння ўжо сёлета тэмпы меліярацыйных работ падвоены, будзе аднаўлена больш як 55 тысяч гектараў меліяраваных зямель», — удакладніў віцэ-прэм'ер.

Асноўнымі рэзервамі росту ў жывёлагадоўлі з'яўляецца мэтанакіраваная работа па якасным паляпшэнні кармавой базы, якая дае магчымасць максімальна рэалізаваць генетычны патэнцыял сельскагаспадарчых жывёл і птушкі. Гэты кірунак у асноўным сканцэнтраваны на галіне раслінаводства і далейшым абнаўленні вытворчай базы, будаўніцтве, рэканструкцыі і мадэрнізацыі жывёлагадоўчых аб'ектаў.

— Дзякуючы праведзенай мадэрнізацыі малочнай галіны цяпер у краіне ёсць 1,6 тысячы малочнатаварных ферм з сучаснымі тэхналогіямі, на якіх размешчана 65 % дойнага статка і вырабляецца каля 70 % малака, — паведаміў Леанід Заяц. — Для прадаўжэння работы па мадэрнізацыі малочнай жывёлагадоўлі на 2023–2024 гады запланавана будаўніцтва па 10 малочнатаварных комплексаў у кожнай вобласці.

## НА ЎМОВАХ МЭТАВАЙ ПАДРЫХТОЎКІ

Асобна намеснік прэм'ер-міністра спыніўся на пытанні рэалізацыі кадравай палітыкі ў сельскай гаспадарцы. «Папаўненне кадравага складу сельскагаспадарчых арганізацый у асноўным павінна ажыццяўляцца за кошт падрыхтоўкі спецыялістаў ва ўстановах аграрнай адукацыі, асабліва на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі, — перакананы Леанід Заяц. — Гэта катэгорыя найбольш арыентаваных абітурыентаў, у якіх зацікаўлены арганізацыі — заказчыкі кадраў. Зацікаўленыя арганізацыі ўстанаўліваюць у мэтавых дагаворах даплаты да стыпендый у перыяд навучання, забяспечваюць праходжанне вытворчай практыкі і працаўладкаванне выпускнікоў тэрмінам на пяць гадоў, пасля заканчэння якіх, як паказвае практыка, большасць мэтавікоў застаюцца працаваць у гэтай арганізацыі на пастаяннай аснове.

Рэзюмуючы сваё выступленне, Леанід Заяц падкрэсліў, што аграпрамысловы комплекс гатовы забяспечыць сваё прызначэнне і ў далейшым быць стабілізатарам у эканоміцы, у нашым грамадстве.

**Вераніка КАНЮТА.**

# КОЛЬКІ КАШТУЕ СУСТРЭЦЬ НОВЫ ГОД У САНАТОРЫІ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Навагодняя праграма істотна адрозніваецца ад звычайнага знаходжання ў санаторыі. Акрамя комплексу медыцынскіх паслуг (а ўсе пуцёўкі набыты з гэтай опцыяй), праграмы будуць насычаны святочнымі мерапрыемствамі. Гэта канцэрты артыстаў беларускай эстрады, майстар-класы з нацыянальным каларытам, вулічныя гулянні, спартыўныя мерапрыемствы з акцэнтам на зімовыя віды спорту. Сёлетняе надвор'е ім спрыяе, і амаль усе санаторыі ўключылі ў праграмы масавыя лыжныя прагулкі. І, вядома, традыцыйны навагодні банкет з Дзедам Марозам і Снягуркай. Напрыклад, адзін з найлепшых беларускіх санаторыяў, «Альфа Радон», прапануе сёлетні навагодні банкет пад назвай «Рускія сезоны» — у стылі рускага дваранства з тэматычным фуршэтам, класічнай музыкай і творчымі майстар-класамі.

У цэлым адзін дзень знаходжання ў гэты час у санаторыі складае каля 93 рублёў, кошт навагодняга банкета — у сярэднім 195 рублёў. Большасць санаторыяў на Новы год ужо забраніравана. У тым ліку адзін з самых нятанных — санаторый «Пліса» — паведамляе, што свабодных месцаў на Новы год не засталося. А вось санаторыі сярэдняй цэнавай катэгорыі яшчэ маюць свабодныя нумары, напрыклад санаторый «Крыніца» пад Мінскам. Цана навагодняга банкета тут — 195 рублёў.

— Сёння санаторыі працуюць у рэжыме санітарна-эпідэміялагічнага дабрабыту, — падкрэсліў Генадзь Балбатоўскі. — Няма ўспышак захворванняў, пры тым што зараз санаторыі запоўнены на 80 %. За апошнія гады гэта адзін з самых высокіх паказчыкаў запаўняльнасці ў асенне-зімовы перыяд, што сведчыць пра высокі попыт на такі від паслуг.

Актыўна ідзе браніраванне і зімовых месяцаў. Студзень забраніраваны на 67 %, люты — больш чым на 40 %. Папярэднія вынікі года сведчаць пра тое, што сістэма санаторна-курортнага лячэння спрацавала паспяхова. Удалося выйсці на паказчыкі дзейнасці ўдачнага 2019 года, нават па некаторых пазіцыях пераўзысці. А калі параўноўваць з мінулым годам, то сёлетні стаў нашмат больш паспяховым. Выручка па экспарце паслуг вырасла на 70 %, а агульная выручка — на 46 %. У грашовым выражэнні выручка ад экспарту паслуг складзе 100 мільёнаў долараў.

## У ЛАГЕР — ЗІМОЙ

Запланавана і аздараўленне школьнікаў падчас зімовых канікул у лагерах, у тым ліку стацыянарных з кругласутачным знаходжаннем. Мяркуецца, што аздараўленне ў лагерах розных тыпаў пройдзе больш за 60 тысяч дзяцей. Менавіта столькі заявак атрымана ад бацькоў.

Усе ахвотныя і тыя, хто мае патрэбу ў аздараўленні, атрымаюць такую магчымасць, звяртае ўвагу Генадзь Балбатоўскі. Лагеры прымуць школьнікаў з 23 снежня да 7 студзеня. Запланаваны такі ранні пачатак канікул, бо будуць функцыянаваць кругласутачныя стацыянарныя лагеры, і працягласць пуцёўкі там — не менш за 9 сутак. У такіх лагерах на зімовых канікулах адпачне больш за паўтысячы дзяцей. На правядзенне зімовых канікул Рэспубліканскаму цэнтру па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні выдаткавана 1,7 мільёна рублёў.

Найбольшы попыт, дарэчы, на аздараўленне ў Віцебскай вобласці — там у лагерах адпачне больш за 10 тысяч дзяцей. У Мінскай — 9,6 тысячы, у Брэсцкай — 9,4, Гомельскай — 8,9, Мінску — 7,9, на Магілёўшчыне — 7,5, Гродзеншчыне — 4. Праграмы ў лагерах таксама тэматычныя, а ўсе кругласутачныя лагеры — профільнай накіраванасці з акцэнтам на навагоднія святы і насычанай экскурсійнай праграмай.

**Алена КРАВЕЦ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## У СААЗ заявілі аб глабальным дэфіцыце антыбіётыкаў



Дэфіцыт антыбіётыкаў, у прыватнасці пеніцыліну і амаксіцыліну, назіраецца ў свеце на фоне росту колькасці інфекцыйных захворванняў. Аб гэтым паведаміла газета Financial Times са спасылкай на кіраўніка групы СААЗ па забеспячэнні лекавымі сродкамі і доступу да іх Лізу Хедман. Па яе словах, 80 працэнтаў з 35 краін, дадзеныя па якіх збірае СААЗ, адчуваюць востры недахоп антыбіётыкаў пеніцылінавага раду. У ЗША і Канадзе, як адзначаецца, назіраецца недахоп амаксіцыліну, у той час як у ЕС аб дэфіцыце некаторых антыбіётыкаў паведамілі 25 з 27 краін-членаў. Паводле дадзеных Financial Times, некаторыя амерыканскія і еўрапейскія фармацэўты таксама заяўляюць аб дэфіцыце распаўсюджаных абязбольвальных прэпаратаў у сувязі з павышэннем попыту на іх з-за зімовай хвалі захворванняў на грып, рэспіраторна-сінцыцыяльны вірус і каранавірусы. Выданне, спасылаючыся на генеральнага сакратара Фармацэўтычнай групы ЕС, паведаміла, што таксама назіраецца недахоп лекаў для лячэння такіх захворванняў, як туберкулёз і скурныя інфекцыі.

## Ілан Маск пацвердзіў, што пакіне пасаду кіраўніка Twitter



«Я пакіну пасаду генеральнага дырэктара Twitter, як толькі знайду кагосьці дастаткова дурнога, хто пагодзіцца на гэтую работу», — іранічна напісаў Маск у сацсетцы. Мільярдэр пры гэтым дадаў, што будзе працягваць працаваць у камандзе Twitter, бо пасля сыходу з пасады кіраўніка кампаніі мае намер узначаліць аддзелы па праграмным забеспячэнні і абслугоўванні сервераў. Раней Ілан Маск апублікаваў у сацсетцы апытанне, у якім цікавіўся, ці павінен ён па-ранейшаму быць каля руля кампаніі. Прадпрымальнік абяцаў, што падпарадкуецца волі прагаласаваўшых. У галасаванні ўзялі ўдзел больш за 17,5 мільёна карыстальнікаў. З нязначнай перавагай перамаглі тыя, хто выступае за сыход Маска з пасады гендырэктара Twitter. Тэлеканал CNBC паведамляў, што Маск зараз вядзе актыўныя пошукі таго, хто хацеў бы стаць новым кіраўніком сацсеткі.

## Кліматычныя актывісты адпілавалі верхавіну каляднай ёлкі ў Берліне



Кліматычныя актывісты з групы «Апошняе пакаленне» адпілавалі верхавіну каляднай ёлкі ў Берліне насупраць Брандэнбургскай брамы, паведаміла Associated Press. Два члены групы выкарыстоўвалі гідраўлічны пад'ёмнік і ручную пілу, каб адпілаваць двухметровую верхавіну з 15-метровай елкі. Яны таксама вывесілі плакат з подпісам «Гэта толькі вярхушка каляднай ёлкі». У «Апошнім пакаленні» заявілі, што такім чынам актывісты хацелі падкрэсліць, што пакуль Германія бачыць толькі «вярхушку» кліматычнай катастрофы, якая назіраецца ва ўсім свеце. Яны заклікалі канцлера Германіі Олафа Шольца прыкладаць больш намаганняў для барацьбы з глабальным пацяпленнем. У Германіі, як і ў многіх іншых краінах, у апошнія месяцы кліматычныя актывісты рознымі спосабамі выказвалі пратэсты супраць дзеяння улад, у тым ліку блакіравалі дарогі і кідалі ежу ў вядомыя карціны.

# ЗАМЁРЗЛЫЯ ШПРОТЫ

## Як жыхары Латвіі сустракаюць навагоднія святы?




**Латвія выбілася на першае месца па ўзроўні інфляцыі ў Еўрасаюзе, з горкай іроніяй паведаміў bb.lv. Даволі доўга гэтая краіна была на трэцім месцы ў спісе еўрапейскіх аўтсайдараў, традыцыйна саступаючы Эстоніі і Літве. І вось па выніках мінулага месяца Рыга ўстанавіла нацыянальны антырэкорд. У лістападзе інфляцыя ў Латвіі склала 21,7 працэнта (у сярэднім па еўразоне — 10,1 працэнта), сведчаць даныя Eurostat. Спажывецкія цэны ў дадзенай прыбалтыйскай краіне ў параўнанні з кастрычнікам узраслі на 1,1 працэнта. Як адзначаюць эксперты, асноўны ўклад у «дасягненне» ўнёс рэзкі рост кошту энерганосьбітаў і харчавання. Улады старанна адпрацоўваюць палітычны заказ сваіх заакіянскіх «куратараў» — значна павялічваць укладанні ў ваенную сферу і разбураць сувязі з суседнімі Беларуссю і Расіяй. Усё гэта толькі пашырае маштабы сацыяльна-эканамічнага крызісу ў краіне, што негатыўна ўплывае на дабрабыт насельніцтва. Вядома, з-за такой сітуацыі людзі проста ў адчаі. Як жыхары Латвіі сустракаюць навагоднія святы?**



### Цукровае «ралі»

На працягу апошніх пяці месяцаў інфляцыя ў Латвіі перавышала адзнаку ў 20 працэнтаў. «Цяпер мы вельмі блізкія да піка інфляцыі. Можа быць, мы ўжо дасягнулі яго», — адзначыў bb.lv эканаміст Банка Латвіі Алег Краснапёраў. Як заўважыў эксперт, няма падстаў спадзявацца на хуткі пералом у дынаміцы інфляцыі. «Мы бачым усё больш значны ўплыў на прадукты харчавання», — заўважыў дырэктар Дэпартамента макраэканамічнай статыстыкі Цэнтральнага статыстычнага ўпраўлення Інтар Абражунс. На думку спецыялістаў, менавіта прадукты разам з камунальнымі плацяжамі і транспартам з'яўляюцца базавымі артыкуламі, якія будуць даражэць і ў выніку вызначаць памер гадавой інфляцыі.

У групе прадуктаў харчавання і безалкагольных напіткаў цэны за год у Латвіі ўзраслі на 29,5 працэнта. Адчувальна падаражэлі цукар (82,6 %), мука і крупы (53,6 %), малако (43,2 %), хлеб (39,3 %), кандытарскія вырабы (28,3 %), макаронныя вырабы (31,9 %), рыс (35,2 %), сухія сняданкі (20,9 %). Даражэйшымі сталі сыр і тварог (37,2 %), малочныя прадукты (37,6 %), сметанковае масла (37,2 %), яйкі (20,2 %), ёгурт (19,2 %).

Павялічыліся цэны на вяленае, салёнае або вэнджанае мяса (23,9 %), мяса хатніх птушак (40,6 %), свініну (22 %), мясныя прадукты (23,6 %) і ялавічыну (36,5 %). За год таксама падаражэлі кава (33 %), свежая гародніна (22,7 %), свежая садавіна (20 %), кансерваваная або перапрацаваная рыба і морапрадукты (30,6 %), марожанае (22,2 %), шакалад (19,7 %), алей (34,4 %), соусы і заправкі (45,1 %), фруктовыя і агароднінныя сокі (17,1 %).

Змяніліся цэннікі на варэнне і мёд (23,1 %), прысмакі (27,9 %), замарожаную рыбу (37,4 %), безалкагольныя напоі (20,7 %), соль і спецыі (35,7 %), свежую або ахаладжаную рыбу (20,8 %), сушаную, кансерваваную або перапрацаваную гародніну (20,6 %), гатовыя да ўжывання прадукты (28,4 %), сухафрукты і арэхі (20,2 %), маргарын (31,9 %), чыпсы (35,6 %), аліўкавы алей (17 %), вяленую, вэнджаную або салёную рыбу (19,8 %), а таксама чай (14,8 %).

Сярэдні ўзровень цэн на алкагольныя напіткі і тытунёвыя вырабы за год павялічыўся на 6,2 працэнта. Цэны на алкагольныя напіткі выраслі на 7,1 працэнта: за год падаражэлі моцныя спіртныя напіткі, піва і віно, а цэны на тытунёвыя вырабы павялічыліся ў сярэднім на 4,7 працэнта.

### Непад'ёмная «камуналка»

Сярэдні ўзровень цэн на тавары і паслугі, звязаныя з жыллём, за год павялічыўся на 44,4 працэнта. Найбольш значны рост цэн адбыўся на цеплавую энергію, цвёрдае паліва, прыродны газ і электраэнергію. Падаражэлі паслугі водазабеспячэння, каналізацыі, вывазу смецця, матэрыялы для ўтрымання і рамонту жылля, паслугі па ўтрыманні і рамонце жылля, а таксама паслугі па кіраванні жылфондам.

У групе аховы здароўя сярэдні ўзровень цэн за год павялічыўся на 9,1 працэнта. Падаражэлі стаматалагічныя паслугі, фармацэўтычная прадукцыя, паслугі ўрачоў-спецыялістаў, акуляры і кантактныя лінзы, паслугі лабараторый для правядзення медыцынскіх аналізаў і радыелагічных цэнтраў.

Цэны на тавары і паслугі, звязаныя з транспартам, за год узраслі на 18,2 працэнта, што абумоўлена ростам кошту паліва на 28,4 працэнта. Дызель стаў даражэйшым на 38,7 працэнта, бензін — на 17,5 працэнта, аўтагаз — на 7,5 працэнта. Павышэнне цэн адбылося на тэхнічнае абслугоўванне і рамонт асабістага аўтатранспарту, запасныя часткі і аксесуары для аўто, аўтамабілі з прабегам, аўтамабільныя пасажырскія перавозкі, новыя аўто, а таксама пасажырскія авіяперавозкі.

Цэны на тавары і паслугі, звязаныя з адпачынкам і культурай, узраслі за год на 8,8 працэнта. Падаражэлі кармы для жывёл, паслугі па баўленні вольнага часу і заняткаў спортам, канцтавары і прылады для малявання, комплексныя паслугі вольнага часу, абанентская плата за тэлебачанне, кветкі, а таксама газеты і часопісы.

Сярэдні ўзровень цэн на рэстаранна-гасцінічныя паслугі за год павялічыўся на 19,2 працэнта. Падаражэла грамадскае харчаванне, у тым ліку наведванне рэстаранаў і кафэ — на 17,4 працэнта, сталовых — на 19 працэнтаў і пунктаў хуткага харчавання — на 19,3 працэнта. Паслугі атэляў таксама сталі адчувальна даражэйшымі. У іншых групах спажывання найбольш значны рост цэн на працягу года быў на адзенне, абутак, а таксама на тэлекамунікацыю.

### «Убачыла цэны — і апетыт знік»

Жыхары Латвіі пачалі баяцца крам, піша press.lv са спасылкай на штотыднёвік vesti.lv. Таму што кожны раз цана на звыклы тавар становіцца ўсё вышэйшай. Традыцыйны набор прадуктаў, які купляе сям'я гадамі, вырас удвая, а то і ўтрая. «Жывём з мужам удваіх, — распавяла чытачка Яўгенія Георгіеўна. — Муж на пенсіі, я пакуль працую. Грошай стала не хапаць, хоць яшчэ нядаўна мы маглі сабе дазволіць паездку ў адпачынак раз на год, куплялі білеты ў тэатр па 30-40 еўра. Цяпер увялі рэжым жорсткай эканоміі — толькі самае неабходнае».

Чытачы vesti.lv расказваюць, што звыклы кошык тавараў моцна падаражэў, і бюджэт, які раней планаваўся на куплю прадуктаў, даводзіцца павялічваць. За кошт чаго — вось пытанне. «Мой звычайны набор прадуктаў (тварог, смятана, малако, пячэнне, сасіскі, курыца, памідоры, хлеб, масла, алей, макароны, грачаная або рысавая крупы, цукар, чай) стаў даражэйшы ўдвая, а алей і крупы — у разы», — кажа рыжанка Вікторыя. Яна распавяла, што звычайна на паўсядзённыя пакупкі ў яе сыходзіла 10 еўра, летась сума павялічылася да 20, а зараз не заўсёды ў 30 еўра ўкладваецца.

Як заўважае vesti.lv, «курыца, якую прывыклі есці ў мэтах эканоміі, зараз каштуе, амаль як заморскі страус, — 9 еўра без цэнта за кілаграм філе! Як кажа адна чытачка: «Убачыла цэны — і апетыт знік». І мяса засталося толькі панюхаць ці ў святы гатаваць, калі грошы застануцца: кілаграм ялавічыны каштуе ад 7 да 10 еўра, свініна — не нашмат таннейшая.

Малочныя прадукты, да якіх латвійцы прывыклі, цяпер так «кусаюцца», што думаеш: можа быць, тварог без смятаны можна есці, а бутэрброд без масла і кашу варыць на вадзе?»

У Латвійскай асацыяцыі гандляроў харчовымі прадуктамі адзначылі, што зараз пакупнікі больш старанна падыходзяць да выбару прадуктаў у магазіне. Статыстыка паведамляе, што падзенне ўзроўню жыцця латвійцаў, якія атрымліваюць мінімальную зарплату, гэтай восенню склала каля 22 працэнтаў. Узровень жыцця знізіўся як мінімум на 15 працэнтаў у параўнанні з леташнім. Людзям, якія атрымліваюць мінімальныя і нізкія заробкі, гэтай зімой давядзецца рэзка скараціць усе выдаткі, не звязаныя з выжываннем, і адмовіцца ад ранейшага асартыменту прадуктаў. Гэта азначае зніжэнне ўзроўню і якасці жыцця.

Паводле дадзеных Цэнтральнага статыстычнага ўпраўлення, большасць у Латвіі зарабляе менш за сярэдні заробак у месяц, а 10 працэнтаў — менш за мінімальны заробак.

Латышы пачалі актыўна выкарыстоўваць свае зберажэнні, каб пакрыць штодзённыя выдаткі на куплю прадуктаў і на жыллё, узрос попыт і на спажывецкія крэдыты. Банкі паведамляюць, што людзі пачалі здымаць грошы са сваіх укладаў. Напрыклад, у сакавіку 25 працэнтаў жыхароў Латвіі адзначыла, што яны былі вымушаныя пачаць выкарыстоўваць зберажэнні, а ў верасні гэта прызнала ўжо прыкладна трэць апытаных. Як адзначаюць эксперты, гэтая тэндэнцыя ўзмоцніцца, паколькі самы складаны этап у адносінах да жыллёвых затрат яшчэ наперадзе, адзначаюць эканамісты.

### Хваля крадзяжоў

Рост цэн таксама «паспрыяў» актыўнасці злодзеяў. «Мы бачым, што даходы людзей зніжаюцца ці ў горшым выпадку нехта ўвогуле пазбаўляецца крыніцы даходу. Ёсць людзі, якія бяруцца за крадзеж», — акрэсліў tv3.lv агульныя тэндэнцыі ў сферы крамных крадзяжоў кіраўнік Асацыяцыі ахоўных кампаній Арніс Марцінкевіч. «У злодзеяў розныя матывы. Магчыма, людзі цяпер могуць пакласці нешта ў кішэню, таму што проста не могуць сабе дазволіць купіць усё неабходнае для паўсядзённага жыцця з улікам інфляцыі і павелічэння штомесячных выдаткаў», — кажа член праўлення і дырэктар па маркетынгу сеткі крам «Top!» Ілзе Прыедзіце.

«Калі раней існавалі асобныя сацыяльныя групы, якія можна было ідэнтыфікаваць як патэнцыйных злодзеяў, то цяпер вылучыць адмысловую групу рызыкі ўжо немагчыма, таму што крадуць ад падлеткаў і нават дзяцей да пенсіянераў. На крадзяжах трапляюць людзі самага рознага ўзросту і сацыяльнага становішча. Гэта тыпова для гэтага года, — кажа Арніс Марцінкевіч. — Раней з гандлёвых пунктаў кралі ў асноўным даражэйшыя і каштоўныя рэчы, такія як алкаголь і каву, спрабуючы прадаць іх. Цяпер крадуць нават масла, хлеб і іншыя элементарныя прадукты, каб проста паесці. Пенсіянер проста кладзе пачак масла ў мяшок ці сумку і спрабуе выйсці з крамы. Падлеткі таксама крадуць. Нават дзеці «тыраць» прысмакі. Хоць такія выпадкі былі заўсёды, зараз іх больш. Мабыць, бацькі не могуць купіць ім пачастункі, таму яны знаходзяць іншы спосаб дастаць іх — хапаюць у краме».

Арніс Марцінкевіч адзначае, што гэта стварае дадатковую нагрузку і стрэс для ахоўнікаў. Цяпер практычна кожны наведвальнік магазіна знаходзіцца пад падазрэннем. Акрамя таго, калі раней увагу можна было засяродзіць на паліцах з дарагімі таварамі, то зараз яна павінна быць нададзена ўсім таварным катэгорыям. Паліцэйская статыстыка сведчыць, што сёлета за дзесяць месяцаў колькасць крадзяжоў, махлярстваў і дробных крадзяжоў (у асноўным магазінных) павялічылася на пятую частку ў параўнанні з тым жа перыядам год таму. Зарэгістравана 6536 такіх злачынстваў, што на 1109 больш, чым за такі ж час летась.

Праблемы адчуваюць і гандляры палівам. Ёсць як кліенты, якія проста запраўляюцца і з'язджаюць, не заплаціўшы, так і тыя, хто дадаткова выкарыстоўвае падробленыя нумарныя знакі, кажа выканаўчы дырэктар Латвійскай асацыяцыі гандляроў палівам Іева Лігер. «Здараюцца выпадкі, калі адзін і той жа чалавек неаднаразова ўчыняе крадзяжы на розных запраўках у розных сетках, — дадае Лігер. — Колькасць крадзяжоў на запраўках павялічылася разам са значным ростам цэн на паліва».

### Без падарункаў і пачастункаў

Інфляцыя і эканамічная сітуацыя паўплываюць на тое, як жыхары Латвіі будуць сустракаць святы. Кожны другі спадзяецца скараціць выдаткі на святкаванне Каляд і Новага года, пры гэтым часцей за ўсё людзі плануюць сэканоміць на падарунках і спадарожных выдатках. Такая сумная тэндэнцыя вынікае з апытання жыхароў краіны, праведзенага банкам Citadele напрыканцы лістапада, паведаміў навінавы партал Delfi. У прыватнасці, часцей за ўсё жыхары плануюць сэканоміць на падарунках — такім чынам мае намер паступіць амаль кожны пяты, або 18 працэнтаў рэспандэнтаў.

Апытанне паказала, што больш эканамічныя варыянты падарункаў у асноўным будуць выбіраць жыхары ва ўзросце ад 30 да 39 гадоў, а таксама тыя, хто ўжо пераступіў 60-гадовую мяжу. Радзей эканоміць на падарунках плануюць жыхары ва ўзросце ад 40 да 49 гадоў. Другі спосаб эканоміі звязаны са скарачэннем розных спадарожных святу выдаткаў: 17 працэнтаў апытаных адзначыла, што будуць імкнуцца змяншаць выдаткі на такія рэчы, як, напрыклад, дэкарацыі, святочнае асвятленне, пачастункі. Яшчэ 12 працэнтаў рэспандэнтаў адзначыла, што будуць шукаць іншыя спосабы сэканоміць, у прыватнасці, пры святкаванні ў гасцях пастараюцца падзяліць выдаткі з сябрамі або сваякамі.

**Пётр ДУНЬКО.**

# У ЧАКАННІ ЦУДУ

*Хтосьці калекцыяніруе статуэткі, хтосьці — маркі, хтосьці — каменьчыкі. Я ж ужо гадоў дзесяць збіраю, нанізваю, як пацеркі на нітачку, цёплыя гісторыі. Некаторыя з іх здараюцца са мной, большасць — з маімі сябрамі ці сябрамі сяброў. І гэтыя «цудосінкі», як я іх называю, асабіста для мяне маюць тэрапеўтычны эфект. Ад кожнай новай такой гісторыі на душы становіцца крышачку святлей. Якраз перад святамі мне захацелася падзяліцца з вамі гэтым святлом.*

*Алена і Аляксей нядаўна згулялі вяселле. Яны папрасілі гасцей не дарыць ім кветкі. Бо мноства букетаў, вядома, хоць і выглядае вельмі эфектна, але ж так хутка завяне, не пакінуўшы следу ў жыцці. Замест кветак госці прыносілі... сухі корм для коцікаў. Яго маладыя на наступны дзень пасля вяселля адвезлі ў часовы прытулак для бяздомных і хворых жывёл...*

*Дзядуля са светлым аблічам ужо даўно на пенсіі, але, каб чымсьці сябе заняць і зарабіць хоць якую капейку, пачаў майстраваць драўляныя шпакоўні. Прадаваў іх у пераходзе побач з домам. Наста па дарозе з работы набыла парачку домікаў для птушак і напісала пра гэта на сваёй старонцы ў сацыяльных сетках. Праз колькі дзён я адмыслова паехала ў той пераход, каб падтрымаць дзядулю, але не знайшла ні яго, ні шпакоўняў. Ад бабулі, што гандлявала там вязанымі шкарпэткамі, даведалася, што ўчора ў дзядулі быў ажыятаж: за адзін вечар у яго раскупілі ўсе. Дык ён нават плакаў ад шчасця. Дадому ў той вечар я вярнулася з трыма парамі вязаных шкарпэтак...*

*У Мінску па суботах працуе рыначак «Усё сваё», дзе беларускія фермеры прадаюць самаробныя сыры, выпечку, пасцілу... У дзень нараджэння Уладзіміра Караткевіча там прадавалі і натуральнае марожанае. Ілья, які яго вырабляе, прыдумаў прыгожую акцыю: абменьваў марожанае на вершы. Тым, хто чытаў услых любімыя радкі Уладзіміра Сямёнавіча, дарыў пламбір і... усмешку.*

*Апошнім часам Танюша практычна кожныя выхадныя ездзіць праведаць бацькоў. Ім ужо за семдзесят. Тата гадоў дзесяць як страціў зрок, мама зусім нядаўна зведала хваробу Паркінсона. «Пакуль прыгатуеш паесці ды прыбярэшся ў хаце, дак нават паразмаўляць нармальна не атрымліваецца», — уздыхае стомленая сяброўка пасля кожнай паездкі. І вось нядаўна яна вырашыла зрабіць бацькам сюрпрыз. Адпрасілася з работы і на самай ранняй маршрутцы паехала на малую радзіму сярод тыдня. Зусім адна — без дзяцей. «Цудоўны досвед, — дзеліцца ўвечары пасля вяртання сяброўка, — так класна пасядзелі за гарбатай, пагутарылі...»*

*Наталля вельмі моцна пасварылася з татам. Ехала ад яго дадому ў аўтобусе, трымаючы на руках сваю спячую гадавалую дачку. Усю дарогу плакала, гледзячы ў акно. На прыпынку разам з ёй выйшла маладая пара. Зусім нечакана дзяўчына (той было, як і Наталлі, гадоў 20), працягнула Наташы кветкі (якія, відаць, малады чалавек прынёс ёй на спатканне) са словамі: «Вазьміце, няхай вам ад іх стане крыху цяплей».*

*«Мне так шкада, што ты перажываеш. Але што б ні здарылася, памятай: усё праходзіць...» Аня атрымала гэтую запіску мінулым снежнем, напярэдадні Новага года, калі, перажываючы шмат жыццёвых цяжкасцяў і боль у назе, ехала ў метро ўся ў слязах. Жанчына, якая сядзела побач, перад тым як выйсці з вагона, усунула ёй у руку кавалачак паперы. Прачытаўшы добрае пасланне, Аня разрыдалася яшчэ больш, але запіску захавала. Паперка ляжала ў яе кашальку ўвесь год. І вось днямі ў вагоне метро Аніну ўвагу прыцягнула дзяўчына, якая эмацыянальна размаўляла з кімсьці па тэлефоне, а потым, паклаўшы трубку, расплакалася. І тут Аня зразумела, навошта захоўвала ўвесь час тую запіску... Вось такі кругаварот падтрымкі. Хочацца верыць, што ў запіскі будзе новы атрымальнік. І распачаты ланцужок дабрыні будзе цягнуцца доўга-доўга, дапамагаючы ў цяжкую хвіліну яшчэ многім.*

*Мая сястра з мужам і сынам надоечы былі ў гасцях у сябра-балгарына. Шасцігадовы Мацвейка ўбачыў на рабочым стале гаспадара вялікі грэцкі арэх. І хацеў забраць сабе. «Сынок, спытай у дзядзькі Валодзі, ці можна яго ўзяць. Можа, для яго гэты арэх мае нейкую каштоўнасць.» — «Дзядзька Валодзя, а можна мне забраць гэты арэх?» — «Вядома, але ў нас у Балгарыі ёсць добрая традыцыя: калі пакласці яго ў кішэнь і насіць з сабой, то будзе табе шчасце». Пакуль дарослыя развіталіся, Мацвей сядзеў у машыне. Раптам ён выбег і, расхваляваны жэстыкулюючы, сказаў: «Дзядзька Валодзя, ну не трэба мне тое шчасце! Я проста хачу паглядзець, што там унутры...» І сапраўды, навошта чакаць усё жыццё нейкае прыдуманае дарослымі ўяўнае шчасце? Калі можна жыць тут і цяпер, дзейнічаць, ствараючы цуды сваімі рукамі.*

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**


Сямейная газета

Выпуск № 21 (203)


Тыя, хто побач

**Віталь КАРПАНАЎ:**

# «Ніколі не саромеўся, што я з вёскі»

**Вясёлы, жыццярадасны, шчыры і таленавіты. Пра Віталя Карпанава можна смела сказаць: свой хлопец. Выхадзец з вёскі, ён падкупае сваёй адкрытасцю і дабрынёй. Гурт «Дразды» сёння папулярны як ніколі, а песні на роднай мове даўно палюбіліся беларускай публіцы. Аднак саліст гурта не пакутуе на зорную хваробу, паводзіць сябе сціпла, а пра асабістае жыццё ўвогуле лічыць за лепшае не расказваць. У якасці выключэння спецыяльна для «Сямейнай газеты» Віталь пагадзіўся пагутарыць і не толькі прыадкрыць сакрэт папулярнасці «Драздоў», а і ўзгадаць сваё вясковае дзяцінства, і падзяліцца дэталямі выхавання сыноў.**



## У дзяцінстве разносіў пошту

Віталь не ўтойвае свайго вясковага паходжання. Яго бабуля па матчынай лініі працавала ў калгасе, дзед быў кавалём. Дзядуля па бацькавай лініі быў камбайнерам, заслужаным героем працы. Спявак успамінае, як у дзяцінстве дапамагаў маці разносіць пошту. Валянціне Паўлаўне 67 гадоў, 40 з якіх яна аддала гэтай справе. Спачатку працавала паштальёнам у вёсцы Дзяцел Дубровенскага раёна Віцебскай вобласці, дзе жыла сям'я, а пасля начальнікам паштовага аддзялення ў Валожынскім раёне ў вёсцы Сівіца, куды з цягам часу пераехалі Карпанавы.


*(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)*


Вусацікі-паласацікі

# КОЦІКІ — ЯК ЛЕКІ...

## Як бяздомны Шэрык напоўніў новым сэнсам жыццё беларускага бізнесмена



Барысаўчанка Наталля ЧУДАКОВА ў свой дзень нараджэння падарыла «Катавасіі» новы экспанат «Магістр часу».

**Дні перад Калядамі і Новым годам — час чакання цудаў. Адзін з іх мне пашчасціла назіраць у сталічнай арт-галерэі «Катавасія». Здзейсніла яго барысаўчанка з сімвалічным прозвішчам Чудакова. Калі я брала інтэрв'ю ў заснавальніка «Катавасіі» Васіля Супрунюка і яго жонкі Лізаветы, у галерэю зайшла жанчына з карцінай у руках. «У мяне сёння дзень нараджэння, і я хачу падарыць вам адну са сваіх вышывак з коцікам...»**

## ПРА ХРОСНУЮ ПАКО І РАЗБІТУЮ СВЯЦІЛЬНЮ

Наталля Чудакова распавяла, што стала збіраць фігуркі коцікаў пасля таго, як у яе дома пасяліўся «брытанец». «Але ў параўнанні з калекцыяй Васіля Супрунюка мае 80 процэнтаў статуэтак — кропля ў моры. Калі толькі адкрылася «Катавасія» і мы з сяброўкай прыехалі сюды, дык ачмурэлі ад такой колькасці коцікаў».

— Я і сам не магу адысці да гэтага часу. Часам прыходжу сюды, калі нікога няма, і думаю: які вар'ят усё гэта сабраў? А потым згадваю, што гэта ж я! — смяецца Васіль Супрунюк.


*(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)*




Кашачы сімфанічны аркестр нікога не пакідае абыякавым.

# РАСТВО ТВАЁ, ХРЫСЦЕ БОЖА НАШ!

## 7 важных спраў, якія трэба паспець зрабіць да Каляд

**Раство Хрыстова, мабыць, — галоўнае свята ў хрысціянскім календары (разам з Вялікаднем), і яго значэнне для хрысціян немагчыма пераацаніць. З яго набліжэннем вернікі ўжо шмат стагоддзяў наноў перажываюць радасную падзею Нараджэння Сына Божага, пасланага Богам для выратавання ўсяго чалавецтва — і кожнага з тых, хто жыў і цяпер жыве на зямлі.**

Калі Новы год — у першую чаргу свята свецкае, то Каляды — урачыстасць духоўная, і значыць, на першым месцы павінны быць не падарункі, ёлка і багаты стол, а ўсё ж клопат пра душу. Як падрыхтавацца да Нараджэння Хрыстова, каб у поўнай меры адчуць закладзены ў гэтае свята глыбокі сэнс, мы запыталі ў **настаяцеля прыхода свяціцеля Спірыдона Трыміфунцкага ў Мінску, святара Аляксандра ПАЛЬЧЭЎСКАГА.**

Каб Светлае Хрыстова Раство не ператварылася проста ў яшчэ адну нагоду сабрацца за святочным сталом, трэба паспець да яго надыходу зрабіць сем важных спраў.

### Аддаць перавагу важнаму перад імгненным

— У калядныя дні перад намі прыадкрываецца таямніца нараджэння Бога, — кажа святар Аляксандр Пальчэўскі. — Гэта нешта неспасціжнае: бязмежны Бог па сваёй волі прыняў абмежаванні — чалавечым целам, сіламі, незвычайна малым у параўнанні з вечнасцю тэрмінам чалавечага жыцця. Галоўная мэта, з якой тое было зроблена, — любоў Бога да чалавека. Хрыстос прыйшоў у гэты свет, каб адкрыць людзям веды пра Бога, памёр на крыжы, уваскрэс і праз усё гэта здзейсніў Выкупленне — даў чалавеку магчымасць духоўнага выратавання.

І гэтую велізарную значнасць Раства Хрыстова немагчыма адчуць у поўнай меры, калі не навучыцца хоць бы на час, як сказана ў Пісанні, «аддзяляць збожжа ад пустазелля».

— Царква кажа аб тым, што без духоўнай падрыхтоўкі мы не будзем здольныя адчуць усю радасць і паўнату падзеі Раства Хрыстова. Таму заўсёды неад'емная складнікі жыцця хрысціян пры падрыхтоўцы да Свята Нараджэння Хрыстова — гэта богаслужэнні, малітва і пост, — тлумачыць суразмоўнік.

Царква прадпісвае на працягу ўсяго перыяду посту ўстрыманне ад мясных і малочных прадуктаў. Але важна зразумець, што пост — не проста дыета: ён не абмяжоўваецца адмовай ад пэўных страў і скарачэннем аб'ёму штодзённага рацыёну. Сутнасць посту — ва ўсведамленні, што ў звычайным жыцці мы часта марнуем час на рэчы, якія з'яўляюцца неістотнымі і адцягваюць нас ад сапраўды важных пытанняў — ад духоўнага росту і работы над сабой, тлумачыць святар. Рыхтуючыся да Каляд, мы стараемся часцей бываць на богаслужэннях, браць удзел у таінствах, чытаць духоўную літаратуру і малітвы.

— Усё гэта разам і з'яўляецца падрыхтоўкай да Раства Хрыстова, калі мы стараемся быць больш уважлівымі да сябе і навакольных, да таго, што адбываецца ў нашым жыцці. Сутнасць посту якраз у тым, каб выдаліць няважнае. Сучаснага чалавека акружае вельмі шмат мітусні, і не заўсёды гэта прыходзіць звонку. Часцяком мы самі з'яўляемся яе віноўнікамі: не ўмеем правільна арганізаваць свой час і за дробязямі не здольныя ўбачыць галоўнае. Сэнс посту — у прыярытэце духоўнага над фізічным. Толькі ўнутраная духоўная праца дае магчымасць адчуць прысутнасць Бога ў нашым жыцці. Сказана: «Блажэнны чыстыя сэрцам, бо яны ўбачаць Бога». Каб убачыць Бога, трэба ачысціць сваё сэрца. Гэта абавязковая ўмова. Без гэтага нашы думкі, свядомасць, сэрца будуць перапоўненыя дробязямі, якія выцясняюць Бога з нашага жыцця.



Пачаць выконваць калядны пост не позна нават цяпер, кажа айцец Аляксандр. Але ж Новы год з традыцыйным багатым застоллем прыпадае якраз на перыяд праваслаўнага посту. Што ж рабіць? Адмовіцца ад святкавання?

— У жыцці свяціцеля Спірыдона Трыміфунцкага, якому прысвечаны наш прыход, апісаны такі выпадак: аднойчы ў час посту да яго ў дом пастукаўся падарожнік. Ён быў галодны, а ў свяціцеля, які выконваў строгі пост, не было нічога, што можна было прапанаваць госцю, акрамя кавалка засоленага мяса, які захоўваўся ў склепе. І каб не пакінуць чалавека галодным, ён прапанаваў саланіну падарожніку і сам еў разам з ім. Дзеля любові да чалавека Спірыдон адступіў ад строгасці посту. Ёсць нямала і іншых прыкладаў, калі ў царкве адступаюць ад канона, каб праявіць чалавекалюбства. Таму адказ будзе такі: на Новы год, калі вашы блізкія не падзяляюць вашу веру і не пасцяцца, дапушчальна адступіць ад посту, каб не траўміраваць і не крыўдзіць родных (напрыклад, бацькоў). Але калі абставіны дазваляюць, можна прыгатаваць святочны посны стол. Сёння дастаткова прадуктаў, якія дапамогуць зрабіць навагодняе меню разнастайным і сапраўды смачным: гэта і соевае мяса, і гароднiна-садавіна, і морапрадукты, акрамя таго, у пэўныя дні посту дапускаецца ўжыванне рыбы. А ў цэлым, пытанне посту заўсёды вырашаецца індывідуальна. І кожны вернік са сваім духоўнікам можа дадзенае пытанне агаварыць.

### Часцей бываць у царкве

Каб не страціць за знешнімі атрыбутамі духоўны сэнс свята, важна перад Калядамі як мага часцей бываць у храме, падкрэслівае суразмоўнік. У цэрквах цяпер рэгулярна праходзяць богаслужэнні. Ёсць храмы, дзе службы ідуць штодня. Акрамя таго, асаблівае богаслужэнне праводзіцца на Куццю. Важна таксама як мага часцей удзельнічаць у таінствах споведзі і прычасця.

— На першым месцы ў Свята Раства Хрыстова (як і ў любое хрысціянскае свята) павінна быць наведванне храма, богаслужэння. Без богаслужэнняў, якія апісваюць гэтую евангельскую падзею, мы не можам адчуць усю прыгажосць свята сэрцам і на духоўным узроўні. Калядныя богаслужэнні складзены айцамі царквы многія сотні гадоў таму, і іх канон усе гэтыя гады не мяняўся. Ужо цяпер у ход богаслужэнняў дадаюцца калядныя тэксты, і прыхаджане выходзяць з храма з адчуваннем свята.

### Расказаць дзецям пра Нараджэнне Хрыста

Значнасць Каляд немагчыма зразумець, не ведаючы гісторыі нараджэння немаўляці Ісуса, апісанай у Евангеллі.

— Сама па сабе гэтая евангельская гісторыя вельмі прыгожая і яе нескладана зразумець дзіцяці. Яна добра выкладзена для дзяцей у маляўнічых выданнях, якія сёння ёсць у продажы. У многіх храмах гэтымі днямі праходзяць асаблівыя святочныя падзеі — дзіцячыя спектаклі, канцэрты для дзяцей, і гэта вельмі добрая магчымасць далучыцца да свята з самага ранняга ўзросту.

Але не лішнім будзе і дарослым яшчэ раз нагадаць аб гэтай гісторыі — пачытаць Евангелле, іншую духоўную літаратуру.

— Важна ўспрымаць гэту падзею ў перспектыве, — падкрэслівае айцец Аляксандр. — Бо прадказанне аб Растве Хрыстовым з'явілася за шмат тысяч гадоў да яго, і чалавецтва доўга жыло ў яго чаканні. Увесь Стары Запавет з'яўляецца перыядам падрыхтоўкі да Нараджэння Хрыста. І толькі бачачы гэтую рэтраспектыву, мы можам ацаніць важнасць падзеі. Распавядаючы дзецям аб Раstве, пачынаць варта з гісторыі пра Адама і Еву. Чалавек быў створаны для пазнання Бога. Але першыя людзі — Адам і Ева — парушылі запаведзь Божую, і грэх унёс падзел паміж Богам і чалавекам. Паўстала неабходнасць аднаўлення страчанага адзінства. Гасподзь прайшоў чалавечы шлях і аднавіў гэтую сувязь. У цэнтры прынцыпа плоці Хрыстом знаходзіцца такое паняцце, як Збавенне. Мэта Богаўвасаблення — вяртанне чалавеку той часцінкі Боскага, якая ў ім закладзена. Вяртанне чалавеку ўсёй паўнаты духоўнага жыцця.



### Прысвяціць час дабрачыннасці

Каляды заўсёды былі часам дабрачыннасці.

— Любоў да Бога і любоў да бліжняга — дзве запаведзі, на якіх грунтуюцца і Стары, і Новы Запавет, — кажа Аляксандр Пальчэўскі.

Нескладана сказаць: я люблю Бога і людзей — у абстрактным разуменні, не выказваючы гэтую любоў ніякімі ўчынкамі. Але ці можна ў такім выпадку гаварыць аб рэальнасці гэтай любові?

— Мы маем запаведзь шанавання нядзельных і святочных дзён: шэсць дзён рабі, сёмы — Госпаду Богу твайму. Святы мы прысвячаем Богу, і гэта прысвячэнне выяўляецца ў тым ліку праз міласэрныя справы. Важна, каб чалавек клапаціўся не толькі пра сабе, пра сваё цялеснае або нават духоўнае аблічча, але і выходзіў за рамкі сябе любімага і рабіў дабро для іншых. І Каляды — самы выдатны час, каб вырваць сябе з патоку мітусні і аддаць свае сілы блізкім, а можа быць, нават і зусім незнаёмым. Гэта падстава дапамагчы тым, хто больш за іншых мае патрэбу ў дапамозе. Ёсць традыцыя запрашаць дадому на калядную трапезу адзінокіх пажылых людзей, інвалідаў, наведваць з падарункамі дзіцячыя дамы. Вы здзівіцеся, наколькі адчуеце сябе шчаслівейшымі! Запаведзі дадзены нам Богам як лепшы спосаб уладкавання свету і свайго жыцця.



### Памірыцца з тымі, з кім даўно ў сварцы

— Існуе такі прынцып: калі хрысціянін хоча наведаць храм і прыняць удзел у богаслужэнні і таінствах, спачатку яму неабходна памірыцца са сваімі блізкімі. І толькі тады, з мірам у душы, ён уваходзіць у храм, — кажа суразмоўнік.

Святар падкрэслівае, што ў малітве «Ойча наш» мы звяртаемся да Бога са словамі: «І адпусці нам даўгі нашы, як і мы адпускаем даўжнікам нашым...»

— Калі мы шукаем блаславення Бога і хочам адчуць яго прысутнасць у нашым жыцці, калі мы просім Бога ад даравання, Гасподзь чакае ад нас, што і мы павінны ўсім дараваць. Чыстае сумленне і свет у душы — адна з найважнейшых умоў правядзення свята Хрыстова Нараджэння.

### Выбраць правільныя падарункі

У Евангеллі сказана, што вешчуны прынеслі немаўляці Ісусу дары. Адсюль бярэ пачатак традыцыя рабіць у Раство Хрыстовае падарункі родным і блізкім. На Каляды, падкрэслівае святар, вельмі важна здзейсніць прадуманы выбар падарункаў. Напрыклад, ад дзяцей не варта «адчапляцца» цацкай або гаджэтам: Раство — асаблівы час, і падарунак на Каляды павінен быць асаблівы.

— Сёння спектр таго, што можна падарыць родным і блізкім, досыць шырокі. Гэта можа быць абраз свята ці святога, які мае важнае значэнне для сям'і. Гэта можа быць кніга — у першую чаргу рэлігійная (сёння выдаецца шмат выдатнай праваслаўнай літаратуры) або проста разумная, добрая, якая ўзнімае духоўна. Дзіцяці можна падарыць дзіцячы малітоўнік, бо малітва — зносіны з Богам, выраз нашай сувязі з Ім.

### Прадумаць распарадак каляднага дня

І, вядома, святкаваць Каляды трэба правільна: ужо сапраўды не лежачы на канапе і гледзячы ў тэлевізар. Не варта і сядзець гадзінамі за багатым сталом з цяжкімі стравамі і алкаголем. Як жа зрабіць гэты дзень асаблівым, а не проста падставай для чарговага сямейнага застолля?

— Такая небяспека ёсць, таму важна памятаць: адчуванне паўнаты свята заўсёды звязана з удзелам у богаслужэнні. Калядныя службы ў храмах праходзяць вельмі прыгожа і ўрачыста, узвышаючы душу і пасяляючы ў ёй радасць. Акрамя таго, царква — не толькі спосаб зносін з Богам, але і крыніца ведаў пра яго. Хрысціянскае веравучэнне спасцігаецца ў тым ліку праз богаслужэнне, якое выдатным, дзіўным чынам з розных бакоў апісвае падзею Нараджэння Госпада нашага. І вернікі могуць, знаходзячыся ў храме, глыбока перажываць яго: нараджэнне Ісуса становіцца для іх актуальным, як быццам яна адбываецца цяпер.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

# «Ніколі не саромеўся, што я з вёскі»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

— Бацькі ўжо тры гады няма з намі, — дзеліцца Віталь. — Уладзімір Якаўлевіч займаў пасаду старшыні калгаса, пасля ў Сівіцы быў намеснікам старшыні калгаса «Світанак», працаваў і галоўным аграномам. Мой старэйшы брат Руслан, як і бацька, абраў справай жыцця сельскую гаспадарку — з'яўляецца навуковым супрацоўнікам, дацэнтам Інстытута аховы раслін. Таму сям'я наша — сапраўдныя рупліўцы, якія ведаюць, што такое работа на зямлі.



Спявак разам з мамай Валянцінай Паўлаўнай.

## «Белыя ружы», балалайка і Юрый Антонаў

У шэсць гадоў наш герой пачуў песню «Белыя ружы» гурта «Ласкавы май» і захацеў стаць артыстам. Хлопчыка прынялі ў Івянецкую музычную школу.

— Я хадзіў на балалайку. Любіў бавіць час у нашым вясковым клубе, дзе па выхадных артысты мясцовай самадзейнасці давалі канцэрты. Я рос і глядзеў за ўсёй гэтай культурнай «дзвіжухай», мне гэта ўсё падабалася *(смяецца)*. Назіраў, як на вяселлях ігралі музыкі, стаяў і глядзеў, разявіўшы рот. Гэта захапляла мяне ўсё больш і больш.

***— А цяпер іграеце на балалайцы?***

— Балалайка стаіць у кутку. Колькі гадоў я на ёй адыграў — столькі гадоў ёй трэба і адпачыць, — смяецца артыст.

Першы гурт Віталь сабраў яшчэ ў школе. Ён называўся «ГБС» (Героі будучага стагоддзя). Дарэчы, некаторыя з тых першых песень, што з'явіліся ў школьным ансамблі, Віталь і цяпер выконвае. Напрыклад, песня «Каханая дзяўчына» з таго часу перайшла ў рэпертуар «Драздоў» і з'яўляецца ў слухача адной з любімых.



Гурт «Дразды» заўсёды ў цудоўным настроі.

***— А як бацькі ўспрынялі ваш намер абраць творчую прафесію?***

— Бацькам я сказаў, што хачу стаць артыстам. «Паступай», — адказалі яны. Артыстаў дзе рыхтуюць? У музычным вучылішчы. Юрый Антонаў скончыў Маладзечанскае музычнае вучылішча — вось для мяне быў прыклад. Я павінен быў усімі шляхамі паступіць туды. Юрый Антонаў — вялікі артыст, значыць, і я магу стаць, — усміхаецца Віталь. — І я скончыў менавіта тое вучылішча.

Валянціна Паўлаўна і Уладзімір Якаўлевіч прыслухоўваліся і дапамагалі па магчымасці. Падтрымлівалі сына, казалі, каб вучыўся. Пасля Віталь паступіў у Акадэмію музыкі, і менавіта там з'явіўся гурт «Дразды», які трапіў у 2005-м на сочынскі конкурс «Пяць зорак». Менавіта з гэтай даты пачалася гісторыя ансамбля.

## «А вы слыхали, как поют дрозды?»

***— Адкуль жа такая назва гурта?***

— Назва — вечнае пытанне, якое мне задаюць, — усміхаецца Віталь. — Нас заўсёды натхнялі «Песняры». Уладзімір Мулявін спеў некалі песню «А вы слыхали, как поют дрозды?». Мы, як вось тыя птушкі, даносім нашы песні. Таму так сугучна: «Песняры» — «Дразды». Наш ансамбль з'яўляецца музычным прадаўжальнікам вялікіх «Песняроў», а наш рэпертуар — «Хата бацькоў», «Беларуская мова», «Сланечнік» — гэта не што іншае, як працяг іх традыцый.

Родная мова заўсёды падабалася спеваку. Ён з цеплынёй згадвае сваю класную кіраўніцу і настаўніцу беларускай мовы і літаратуры Алену Бернардаўну Рос, якая прывіла любоў да мовы і чытання.

— Я хлопец вясковы і размаўляю на добрай трасянцы. З пераходам на рускую я адчуваў пэўны дыскамфорт, асабліва калі пераехаў вучыцца ў горад. Думаю, гэта бянтэжыла не толькі мяне. Мы ўсе — вясковыя, з глыбінкі, якія з'ехалі на вучобу — сябе крыху ламалі.

Віталь тлумачыць, што з узростам ён зразумеў: трэба быць сабой да канца, паказваць, хто мы ёсць, праслаўляць сваю культуру.

— Гадоў пяць таму зразумеў: калі я такі і на сцэне, і ў песнях, то, аказваецца, нічога шукаць і не трэба. Калі Уладзімір Мулявін здолеў зрабіць беларускую песню папулярнай на ўвесь Савецкі Саюз, хоць ён быў рускім па паходжанні, чаму мы, беларусы, з вёскі, пачынаем пераймаць кагосьці? Самае галоўнае — не саромецца. Ніколі не саромеўся, што я з вёскі. Я проста дадаў вясковага каларыту, мовы — асноўнага. І гэта аказалася надзвычай запатрабаваным. На беларускай эстрадзе быў вакуум, недахоп вось такога настрою. У нас, у гурта «Дразды», ёсць тая «разыначка» — мы можам даносіць мову. На жаль, не кожны гарадскі жыхар можа ёю валодаць.

## Нараджэнне песні

— Песні нараджаюцца дзякуючы назапашванню жыццёвага вопыту, — гаворыць Віталь. — З'яўляюцца вершы. Так нарадзілася шчымлівая песня «Хата бацькоў». Пра самае дарагое, што ў нас ёсць, пра тое, як мы вяртаемся дамоў у сталым узросце. Сыходзяць бацькі, падрастаюць нашы дзеці, але застаецца родная хата — як працяг усяго.

Цяпер мы працуем над вялікім сумесным праектам з нашым беларускім паэтам Леанідам Пранчаком. Ужо выйшлі такія творы, як «Мама», «Сланечнік», «Беларуская мова». Нядаўна выйшаў кліп на песню «Мама», слухачоў радуе новая песня «Вярба».

Большасць кліпаў гурта знята ў роднай вёсцы Сівіца і ў яе ваколіцах. Падчас гастроляў па Беларусі артысты могуць прыпыніцца каля любой хаты ў любой вёсцы і пачаць здымаць відэа для будучага кліпа. Па словах саліста, там жыве цеплыня, якая праз мітусню застаецца незаўважанай. Але калі гэта «абгарнуць» у песню, кожны можа адчуць вялікі водгук у сэрцы, ва ўспамінах вярнуцца ў дзяцінства да бабулі, бацькоў. І ў гэтым, лічыць вакаліст, ёсць сённяшняя патрэба.

## Мы простыя хлопцы

***— Цікава, а калі прыязджаеце да мамы, што першае просіце прыгатаваць?***

— Я прашу скварак насмажыць з блінамі і дранікі, — усміхаецца артыст. — Дарэчы, усе новыя песні паказваю маме. Раней, калі ў нас былі іншыя песні, яна магла выказаць незадаволенасць, а сёння, калі ў нас такая лінейка душэўных кампазіцый, мама з удзячнасцю кажа: няўжо, сынок, ты спяваеш правільныя песні? — смяецца саліст.

***— Віталь, раскажыце пра свае рарытэтныя матацыклы — яны засталіся вам у спадчыну?***

— «ІЖ Планету-5» далі бацьку ездзіць па палях, калі ён быў аграномам. Яшчэ ёсць «Урал» з каляскай. На матацыкле я аб'язджаю ўсе свае месцы юнацтва, дзе цалаваўся першы раз, дзе палілі вогнішча, куды дзяўчат вазіў — каб напоўніць душу цеплынёй і творчасцю.

***— Цікава, ці змянілася стаўленне да вас у аднавяскоўцаў, усё ж такі вы знакамітасць?***

— Мы не зоркі, як, напрыклад, Філіп Кіркораў, мы простыя хлопцы. Мы з усімі стасуемся, можам выступіць на вяселлі. Да гэтага ставімся проста, так і да нас ставяцца. «Прывітанне, Віталя!» — так, па-простаму, са мной вітаюцца аднавяскоўцы. Для іх я заўсёды свой хлопец з нашай вёскі.

***— А за што найперш удзячны вёсцы і бацькам?***

— За тое, што вёска мяне выхавала як чалавека, за прыроду, за тую прыгажосць і гармонію, якую я адчуваў з году ў год з маленства. За лета, за дыскатэкі, за працу, за любоў да Радзімы. Гэта бясконца можна пералічваць.

Бацькам я ўдзячны за тое, што мяне і брата накіроўвалі ў правільным рэчышчы. Падтрымлівалі, удзельнічалі ва ўсіх пачынаннях і за тое, што вырасцілі нас. Яны навучылі правільна адносіцца да людзей. Быць шчырым, сяброўскім, а самае галоўнае — працалюбівым і верыць у сваю мару. Усяго можна дасягнуць, галоўнае — не апускаць рукі.



Бацька Віталь з сынамі Рыгорам і Якавам.

Гледзячы на сваіх бацькоў — як будавалі яны дом, трымалі гаспадарку, выхоўвалі нас у цяжкія часы, — бяру з іх прыклад. Цяпер успамінаю і разумею, што ім было ў тысячу разоў складаней, чым нам цяпер, хоць і сёння жыццё няпростае.

***— А яшчэ вёска навучыла працаваць...***

— Для вясковых хлопцаў гаспадарчыя заняткі не былі праблемай: усё трымалася на нас. Бацькі на рабоце, а ў хляве — дзве каровы, парсючкі, куры, качкі, гусі. Трэба накасіць, навазіць — тут не растлумачыш. Школа і вольны час — гэта ўсё было фонам, астатняе — гаспадарка, — успамінае Віталь.

## Ва ўсім павінна быць гармонія

***— Віталь, цяпер вы ўжо самі бацька, у вас два сыны... Ці цяжка сумяшчаць ролі таты і артыста?***

— Майму старэйшаму сыну Рыгору дзевяць, Якаву — два. Увогуле, лёгкага нічога няма ў жыцці. Складана ўсё сумяшчаць, але ў мяне ёсць жонка, якая мне дапамагае. Нялёгка быць артыстам, але калі ў сям'і ўсё дружна, тады весялей. Ганна — чалавек творчай прафесіі, таксама музыкант, іграе на скрыпцы. Мы разам даўно, яшчэ з Акадэміі музыкі. Я не хаджу на бацькоўскія сходы, у гэтым плане я дрэнны бацька. Гэтым займаецца жонка, я магу толькі вазіць-развазіць, забіраць — практычная функцыя, — усміхаецца Віталь.

— Сваіх хлапчукоў вучу ўсяму, чаму вучыў нас бацька. Мужчына павінен і малаток умець трымаць, і адвёртку, і ў футбол пагуляць, і рагатку зрабіць... Усяму, чым хлопцы займаліся ў вёсцы, стараюся навучыць сваіх рабят. Што можна рабіць, што — нельга. На «веліках», «моцыках» паганяць, расказаць, як уладкаваны матацыкл. Гэта ж жыццё, без гэтага — нікуды. У нас жа цяпер жыццё паламалася: сацыяльныя сеткі, інтэрнэт. Гэта, вядома, і добра, але ў той жа час перакос вялікі.

***— Падзяліцеся, як змагаецеся з гэтым перакосам?***

— Ва ўсім павінна быць гармонія. Вось спачатку займаемся ўсім, што я пералічыў, а пасля можна і ў тэлефон пагуляць, — смяецца Віталь.

Сямейная традыцыя Карпанавых — збірацца за адным сталом з роднымі. Спачатку ў адных бацькоў, з боку жонкі, потым у бацькоўскай хаце галавы сям'і. Усё проста, па-сямейнаму, як і ва ўсіх, расказвае наш герой. На выхадных, па магчымасці, Віталь з сям'ёй аб'язджаюць усіх бабуль-дзядуляў.

— Як казаў мой бацька, сям'я — ячэйка грамадства, — усміхаецца Віталь. — Гэта галоўнае ў жыцці кожнага, незалежна ад таго хто ты — артыст ці рабочы. Тым больш калі ты артыст і карміцель, ты павінен вярнуцца дамоў, у цябе дзеці павінны быць сытыя, а ў доме — парадак і ўтульнасць. І самае галоўнае — гармонія, каб усе былі задаволеныя і спакойныя, — лічыць артыст.

Аднак у той жа момант, паводле меркавання героя, сям'я — гэта вялікая праца, без яе нічога не атрымаецца.

— Не бывае, што два чалавекі сустрэліся і далей — толькі «любоў-морковь». Усё роўна гэта ўвесь час праца над сабой, над сваімі эмоцыямі. Трэба вучыцца саступаць адно аднаму, бо калі дэманстраваць усе свае жаданні і не прыслухоўвацца да каханага — нічога не атрымаецца. Трэба знаходзіць кампраміс і ўзаемаразуменне.

**Надзея ЗУЕВА.**

**Фота з сямейнага архіва героя.**

# У жывёл трэба вучыцца



*Чараўнік наш Янка кот,*
*забаўляе ён народ,*
*а дзяцей на Новы год*
*запрашае ў карагод!*
**Іван ЮРКІН.**

**У сем'ях многіх вядомых людзей ёсць кошкі — талісманы надыходзячага года. Мы распыталі іх аб гадаванцах, іх характары і звычках, а таксама пра тое, якім якасцям павучыцца ў коцікаў.**

## Ганна ФОКІНА: «Кот і трус — паўнапраўныя члены нашай сям'і»

Прадстаўнікі абодвух знакаў надыходзячага года — дэкаратыўны трус Крош і кот Васіль — жывуць у сям'і Ганны Фокінай, вядучага майстра сцэны Вялікага тэатра Беларусі. «Яны самі нас выбралі», — кажа



балерына. Кроша яна знайшла кімсьці пакінутым у скрыньцы ў двары дома, а «нічыйны» Вася прыжыўся на лецішчы.

— Мы планавалі завесці жывёлінку, перш за ўсё, для дзяцей. Нам хацелася, каб яны вучыліся клапаціцца, разумець, спачуваць тым, хто слабейшы і больш безабаронны. Збіраліся разам абмяркоўваць кандыдатуру новага члена сям'і. Але калі на вуліцы ўбачылі Кроша — сціснуты камячок са спалоханымі вачыма, якія прасілі: забяры мяне — не маглі прайсці міма, — успамінае Ганна Фокіна. — Ён вельмі ласкавы, ручны, пацешны... Так замілавальна ўмываецца, што за гэтай працэдурай можна назіраць бясконца. Дзеці клічуць труса Крош, а я — Валідол. Калі прыходжу дадому пасля спектакля, кладу яго сабе на калені і гладжу. Адчуваю, як Валідол быццам расцякаецца па нагах і здымае стомленасць.

Сёлета мы паехалі на лецішча, а там на плоце сядзіць такі сапраўдны дваровы кот. Спалоханы, стомлены... Ён нават пабойваўся браць корм. Але дачцэ ўдалося яго прыручыць. Васіль з'явіўся ў той дзень, калі споўніўся роўна год, як не стала нашага сабакі... За год тая рана не загаілася. Не скажу, што Васіль з'явіўся замест сабакі, але ўпэўненая, што нейкія вышэйшыя сілы паслалі нам новага сябра.

Крош ужо дарослы, а Васіль — яшчэ малы, таму яны не сябруюць, але і не б'юцца. А людзям абодва дораць пяшчоту і цеплыню. Мы іх вельмі любім, Крош і Васіль — паўнапраўныя члены нашай сям'і.

Думаю, у жывёл можна і трэба вучыцца назіральнасці, уменню адчуваць настрой чалавека, чакаць свайго моманту. Нашы гадаванцы выдатна ўжываюцца з людзьмі, гэта значыць, знаходзяць такі баланс, калі ўсім камфортна і ўтульна. Вось такога ўмення я жадаю ўсім нам у новым годзе!

## Уладзіслаў МІСЕВІЧ: «Кошка адчувае настрой людзей»

«Не ўяўляю дом без кошкі», — кажа Вольга, жонка заслужанага артыста БССР, «песняра» Уладзіслава Місевіча. Сам жа музыкант у перыяд актыўнай гастрольнай дзейнасці прытрымліваўся іншай думкі. Зрэшты, у той час у сям'і жылі кот Філя і кошка Маргоша, і яны адчувалі настрой Уладзіслава Людвігавіча, разумелі, што дома ён жадае цішыні і спакою, таму не гарэзнічалі.

— Маргошу падарылі на дзень нараджэння нашаму сыну Дзіму, — расказвае Уладзіслаў Місевіч. — Сын узяў на сябе клопат аб кошцы, а недзе праз тыдзень сказаў: «Бацькі, не гатовы я яшчэ да сям'і і дзяцей». Прызнаюся, што ў той перыяд мы крышку «ціснулі» на Дзіму: маўляў, калі жэнішся? Унукаў хочацца. І вось дзякуючы Маргошцы сын зразумеў, што пакуль не гатовы да такога кроку. А мы спынілі, па сутнасці, нетактоўныя пытанні. Каб скончыць дадзеную тэму, скажу, што ўрэшце сын ажаніўся па любові, у яго выдатная сям'я, а ў нас цудоўная ўнучка.

Маргоша — пацешная кошачка, але спачатку ёй прыйшлося нялёгка. Філя як старэйшы па ўзросце спрабаваў яе выхоўваць. Марго ніколі не дэманстравала агрэсію, і ў выніку жывёлкі пасябравалі. А калі Філі не стала, яна ўсё зразумела і таксама перажывала страту.

Не сумняваюся, што Вольга — галоўны чалавек для Маргошы. Упэўнены, жонка разумее інтанацыю кожнага яе «мяў», а кошка чытае па Волiных вачах. Калі ж да нас прыязджае ўнучка Каця, мне здаецца, адбываецца абмен ласкай, пяшчотай паміж дзіцем і кошкай.

Назіраю за ёй на лецішчы, дзе шмат катоў, і бачу, што Марго заўсёды імкнецца пазбегнуць канфліктаў, але калі ўжо ёй па-сапраўднаму наступілі на хвост, умее адказаць.



Марго — выдатная абаронца сваёй тэрыторыі. Калі на лецішчы яна ўлятае ў дом з хуткасцю гуку, значыць, хтосьці адчыняе брамку.

Маргоша неверагодна адчувае настрой людзей. Завяршыўшы канцэртную дзейнасць, я стаў больш бавіць час дома, з'явілася жаданне ўбачыць тое, на што раней проста не звяртаў увагі. Гады тры таму я і ўявіць не мог, што Маргоша заскочыць да мяне на рукі і я буду гладзіць гэты рыжы цуд, а цяпер — папросту!

Людзям варта павучыцца ў коцікаў далікатнасці, чуласці, дыпламатычнасці, іх цудоўнаму ўменню разумець чалавека.

## Надзея ЮРКІНА: «Не настолькі важная парода, як характар»

«Іван Захаравіч Юркін — генерал-паэт» — так пазначаны адзін з нумароў у маім смартфоне. І ніякай памылкі. Іван Юркін — генерал-маёр КДБ у адстаўцы і паэт, на вершы якога напісаны дзясяткі папулярных песень, сярод іх і «Прыязджайце да нас у Беларусь» — гімн гасціннасці нашай краіны. У доме ў Івана Захаравіча і яго абаяльнай жонкі Надзеі Іванаўны жыве вельмі каларытны кот.



— Шаснаццаць гадоў у нас жыў цудоўны белы кот Цімафей, — распавядае Надзея Іванаўна. — Вельмі перажывалі, калі яго не стала. І здавалася, што ніхто яго не заменіць. Мінула два гады, і я адчула, што ўжо гатова ўзяць у дом іншага ката. Я кіравалася эмоцыямі, а Іван Захаравіч думаў рацыянальна: маўляў, мы сталеем — ці не будзе цяжка клапаціцца пра каценя? Але прынцыпова ён не пярэчыў. Мы дамовіліся, што гэта будзе перс, як і Цімафей. Каценя знайшла па аб'яве. Янка адразу спадабаўся — ён быў самы шустры, самы цікаўны і да таго ж вельмі прыгожы.

Клапаціцца аб ім было лёгка, бо каток кемлівы, ахайны, цярплівы. Я і сама Кот па гараскопе, можа, таму мне здаецца, што я яго разумею? У яго нават колер вачэй мяняецца ў залежнасці ад просьбы: хачу есці ці хачу пагуляць. Ён быў вельмі забаўны, пакуль рос. Цацкі насіў у зубах, як сабака. З часам унучка заўважыла, што ён не чыстакроўны перс, а з прымессю мэйнкуна. Тады я зразумела, чаму заводчыца спяшалася прадаць каценят. Але для нас не такая ўжо важная парода, галоўнае — характар гадаванца, а ён у яго выдатны.

Мы жывём за горадам, і, па-мойму, на нашым участку кармушка для птушак з'явілася раней, чым дабудавалі дом. Іван Захаравіч купляе мяшок зерня на зіму і корміць птушак. Аднойчы Янка схапіў птушачку. Мы, канешне, яе забралі. Птушка не пацярпела, толькі, відаць, спалохалася, а Янку мы патлумачылі, што так рабіць нельга. І цяпер скажыце мне, што кот не разумее чалавечай мовы! З таго часу Янка толькі назірае за птушачкамі.

Часам людзі прывозяць у нашу вёску катоў ці сабак, калі жадаюць ад іх пазбавіцца. І вось адна такая кошачка пасябравала з Янкам. Мы ўжо думалі, што возьмем яе ў дом. Але Марыся апярэдзіла падзеі — яна прабралася на веранду і ўладкавалася на Янкавай ляжанцы. З гэтай хвіліны іх сяброўства спынілася. Янка шыпеў і абураўся, што Марыся парушыла яго прастору. На шчасце, кошка была ўладкавана літаральна праз некалькі дзён пасля гэтага канфлікту. Да нас прыехалі сябры, убачылі Марыську, якая сядзела каля брамкі, адразу зачараваліся і вельмі ўзрадаваліся, што можна яе забраць. Цяпер яна любіміца ў іх сям'і.

Мне здаецца, у катоў мы можам павучыцца адданасці, пяшчоце, самадастатковасці, упэўненасці, гонару, уменню пастаяць за сябе. У новым годзе мне хацелася б пажадаць, каб у кожнага чалавека, кожнага ката і сабакі быў хоць бы адзін сябар, каб не было адзінокіх людзей і жывёл.

*Вам жадае Янка кот*
*Жыць шчаслiва, без клапот.*
*Прыгажосць і мілата*
*Будуць з вамі ў год Ката!*

## Раман КОЗЫРАЎ: «У Мінску ў кошкі шмат сваякоў»

«У нашым калектыве тры кошкі і ніводнага сабакі», — жартуе мастацкі кіраўнік Беларускага дзяржаўнага ансамбля «Песняры» Раман Козыраў. Пухнатыя гадаванцы, талісманы гэтага года, ёсць у саліста Ігара Дударчыка, бас-гітарыста Сяргея Байка і ў самога Рамана.

— Нашу кошку клічуць Сімона. У Мінску ў кошкі шмат сваякоў — мы яе калісьці прывезлі з Белавежскай пушчы, побач з якой дом бацькоў маёй жонкі, у якіх жыве кошка Чарнуха, — распавядае Раман Козыраў. — Сімона так спадабалася ўсім нашым сябрам, што яны прасілі і ім прывезці каценят ад Чарнухі. Усе малыя разумныя, прыгожыя, баявыя, непатрабавальныя і вельмі ласкавыя.

Мае дзеці вельмі любяць Сімку — яны так называюць кошку, проста млеюць ад шчасця, калі ўсе разам гуляюць. Вечарамі Сімка закалыхвае дзяцей — спіць на іх. Мы спрабавалі з гэтым змагацца, але зразумелі, што не пераможам. А мяне з жонкай Сімона будзіць — хвілін за дзесяць да званка будзільніка заскоквае на наш ложак.



Калі я дома працую ў студыі, Сімона залазіць мне за спіну і ўважліва слухае мелодыі. Па танальнасці яе «мяў» разумею, спадабалася ёй ці не вельмі. А мне неяк асабліва ўтульна ад таго, што побач ёсць такі крытык.

У нашай кошкі ёсць яшчэ адна неверагодная асаблівасць. Яна ўмее так схавацца ў кватэры, што мы ўпяцярых яе шукаем і не можам знайсці. А потым... раптам з'яўляецца, нібы тэлепартавалася з іншых сусветаў.

Мне здаецца, у катоў можна павучыцца ўменню знаходзіць сваё месца ў жыцці. Гэта вельмі важна і для людзей. Менавіта сваё месца ў жыцці — прафесія гэта ці сям'я — робіць нас шчаслівымі. У новым годзе ад усяго нашага калектыва хачу пажадаць чытачам «Звязды» выканання жаданняў, загаданых у навагоднюю ноч, і, вядома ж, шчасця, міру і дабра!

**Маргарыта ДРАЗДОВА.**
**Фота з асабістых архіваў герояў публікацыі.**

# КОЦІКІ — ЯК ЛЕКІ...

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

Сёння ў арт-галерэі больш за сем тысяч твораў мастацтва ды прадметаў інтэр'ера і побыту ў выглядзе ці з выявамі коцікаў з больш як ста краін свету. Акрамя іх, гасцей «Катавасіі» сустракаюць тры жывыя каты — Пако, Негра і Яша.

***— Раскажыце пра коцікаў, якія тут жывуць. Заўважна, што яны адчуваюць сябе сапраўднымі гаспадарамі...***

— Раней у нас тут было восем коцікаў, — кажа Лізавета Супрунюк. — Але большасць з іх хаваліся, калі прыходзілі новыя людзі. Таму мы вырашылі не мучыць іх і аддалі ў добрыя рукі. Засталіся тры самыя стрэсаўстойлівыя, яны нікога не баяцца. Кладуцца на стол і ўсім сваім выглядам паказваюць — гладзьце на здароўе. Усе трое — звычайныя дваравыя каты, жыццё якіх было пад пагрозай. У Пакошы наогул цікавая гісторыя. Колькі гадоў таму ў Мінск з Францыі прыязджала з візітам мадам Брыжыт Олуа (прадстаўніца славутага Фонду аховы жывёл Брыжыт Бардо. — **Аўт.**). Яе спачатку прывезлі да нас у галерэю, а потым — у пункт часовага ўтрымання «Фаўна горада» на Гурскага, куды прывозяць бадзяжных катоў з усяго горада. Адно кацяня падскочыла і, гледзячы мадам у вочы, пачало «прасіць», каб яна яго забрала. «Не магу цябе ўзяць — мне заўтра ў Францыю ляцець!» — звярнулася да яго госця. Але як толькі яна адышла, ён пачаў енчыць. Урэшце, яна яго забрала і прынесла нам сюды, у «Катавасію». Маўляў, я буду хроснай мамай гэтага кацяняці і даю яму імя Пако. З таго часу мы перапісваемся з мадам Олуа, яна пастаянна цікавіцца жыццём свайго хрэсніка, дасылаем ёй яго фотаздымкі.

Пакуль мы размаўляем, Пако ляжыць на стале каля свайго гаспадара.

***— Можна сказаць, што Пако ваш любімчык? — цікаўлюся ў Васіля Супрунюка.***

— Не, гэта я ў яго любімчык *(смяецца)*. Вы ж бачылі, што ён спаў, але, як толькі пачуў, што я прыйшоў, выбег мяне сустракаць. А я да ўсіх коцікаў стаўлюся аднолькава добра... Мой зайка, — звяртаецца да ката па імені Негра, — ты хочаш залезці наверх, а тут зрабілі перастаноўку. Давай я табе дапамагу *(падсаджвае на шафу з экспанатамі)*.

— Неяк Пако, ускокваючы на шафу, выпадкова разбіў дарагую звяцільню, — згадвае Лізавета. — Якраз у гэты момант зайшоў муж. Усе чакалі, што ён будзе сварыцца...

— А я з парога: «Ой, Пакоша, ты не спужаўся, мой бедненькі, не параніўся?..» *(Смяецца.)* Пасля таго выпадку мы ўсё, што можа ўпасці, прымацавалі, папрыкруцілі.



**«Было б цудоўна, калі б у кожным беларускім офісе жыў коцік», — лічыць Васіль СУПРУНЮК.**



**Жонка Лізавета — галоўная памочніца.**

## ПРА ВУСАТЫ АРКЕСТР І ЖАДАННЕ ДЗЯЛІЦЦА

Калекцыянерам былы ваенны стаў зусім выпадкова.

— Гадоў 20 таму мы гулялі з сябрамі па Кіеву. Яны ўбачылі ў краме керамічную фігурку ката, зробленую мясцовым майстрам, і падарылі яе мужу, — згадвае Лізавета. — Маўляў, вось Васька, гэты кот з камп'ютарам — выліты ты. Потым самі не заўважылі, як у нас дома пачалі з'яўляцца ўсялякія статуэткі ў выглядзе коцікаў. Я нават пачала жартаваць, што яшчэ крыху — і нам не будзе дзе жыць.

— Калі калекцыя коцікаў пераваліла за тысячу, мы яе вывезлі ў свой офіс і расставілі ў шафах уздоўж сцен. Але неўзабаве і там скончылася месца. Неяк падчас адпачынку трапілі ў музей коцікаў у Іспаніі. Тады падумалі: «А чаму б не зрабіць штосьці падобнае ў Мінску?»

Пахадзіўшы па залах арт-галерэі, чарговы раз пераканалася, што чалавечая фантазія бязмежная. Чаго тут толькі няма! І вазы, і чарнільніцы, і падсвечнікі, і начнікі, прадметы для абування і часання спіны, выявы коцікаў, зробленыя з кацінай поўсці ды тапалінага пуху. Але, як і ўсіх наведвальнікаў без выключэння, мяне найбольш уразіў кашачы сімфанічны аркестр, зроблены японскім майстрам Масакі Такашы.

— Майстар выставіў яго на аўкцыён і спачатку не хацеў нам яго прадаваць. Казаў, што рабіў для сваёй краіны, дзе пануе культ катоў. Тым больш там такі аркестр можна было прадаць значна даражэй. Але якраз у той час наляцеў ковід і людзям стала не да мастацтва. Таму нейкім цудам удалося ўгаварыць аўтара прадаць нам сваіх катоў-музыкаў.

***— Баюся нават уявіць, колькі грошай з сямейнага бюджэту пайшло на ўсю калекцыю. Лізавета, як вы ставіцеся да нятаннага захаплення мужа?***

— Я сціплы чалавек. Мне не трэба футры, брыльянты... Мой муж, як і любы кіраўнік фірмы, вельмі стамляецца, бо ўвесь час трэба прымаць рашэнні. Коцікі — гэта яго аддушына, лекі, тут ён адпачывае, сыходзіць ад усіх праблем.

— З узростам хочацца дзяліцца з іншымі тым, што маеш, — дадае Васіль. — Мне падабаецца, што людзі сыходзяць з галерэі ў захапленні. І ад гэтага становіцца цёпла на душы.

— Васіль — чалавек, які ўвесь час чымсьці захапляецца. Калі ён быў афіцэрам і мы жылі на Кубе, ён фатаграфаваў і дзень і ноч. Потым захапіўся кветкамі, збіраў кактусы. Затым былі канцтавары, арт-галерэя. Цяпер у яго новае захапленне — праект «Малінавы кот».

— Малінавы, бо знаходзіцца побач са станцыяй метро «Малінаўка». Што гаварыць, гэта трэба бачыць, — накідвае на шыю шалік з катамі Васіль Супрунюк. — Зараз у нас якраз праходзіць выстава карцін беларускіх мастакоў-катафілаў Рыгора і Наталлі Івановых ды Валянціна Губарава «Кот пад Новы год». Акрамя таго, у «Малінавым кацэ» кожную суботу праводзяцца розныя майстар-класы для дзяцей і дарослых... А побач — «Катабаза», дзе прадаюцца ўсялякія цікавыя рэчы з коцікамі. ...А вось наш галоўны работнік — Тэа. Гэты коцік жыў тут побач на сметніцы, і мы яго вырашылі ўзяць сабе.

«Катавасія», «Малінавы кот», «Катабаза» — гэта цалкам дабрачынныя праекты. Усе грошы, выручаныя ад продажу білетаў ды тавараў, ідуць на лячэнне коцікаў.

— Спачатку ўваход у галерэю быў бясплатным, — кажа Лізавета. — І толькі потым, калі ў нас з'явіліся жывыя экспанаты і цэнтр дапамогі хворым коцікам «Стары кот», увялі ўваходныя білеты. Бо лячыць катоў — дарагое задавальненне.

## ПРА КАЦІНЫЯ РЫСЫ І ДЗІЦЯЧУЮ ТРАЎМУ

Звычайна калекцыянеры падобныя да сваіх экспанатаў...

— Так, муж часта кажа, што ён у душы кот, што вельмі добра іх разумее.

— Кацiных рыс ува мне вельмі шмат. Калі сабакі збіваюцца ў зграі, дык каты гуляюць самі па сабе. Я такі ж — незалежны, самадастатковы. Не ўяўляю, як гэта — мець агульны бізнес з кімсьці. Хоць ствараю ўражанне вельмі кантактнага чалавека, мне цалкам камфортна і аднаму. А яшчэ каты не злапамятныя, я таксама, калі і злуюся, то хутка адыходжу.

Падымаемся ў офіс да Васіля Васільевіча, бізнес якога звязаны з канцылярскімі таварамі. Там нас сустракаюць яшчэ пяць катоў. Перш-наперш дырэктар вітаецца са сваімі гадаванцамі і частуе ласункамі.

— У Беларусі ёсць офісы, дзе жывуць коцікі. Але было б цудоўна, каб іх стала больш. Гэта стала б дадатковай крыніцай, куды можна ўладкоўваць бяздомных жывёл. Каты, у адрозненне ад сабак, не патрабуюць выгулу. Іх трэба толькі карміць і мяняць напаўняльнік у туалеце. Больш за тое, яны ствараюць на рабоце вельмі цёплую абстаноўку. Людзі, акрамя размоў пра накладныя і наяўнасць тавару, пачынаюць размаўляць яшчэ і на душэўныя тэмы. Больш за тое, калі ідзе нарада і на стале ляжыць кот, перагаворы праходзяць больш спакойна. Заўважыў, што калі пачынаю павышаць голас, а кот на мяне глядзіць спужанымі вачыма, я адразу супакойваюся. У нашым офісе ў Баранавічах 9 гадоў жыў коцік-інвалід, мы яго падабралі на вуліцы, ён не хадзіў з-за траўмы пазваночніка. Дык вось, той няшчасны мурлыка вельмі згуртаваў калектыў нашай фірмы. Адно з пытанняў, якое я задаю чалавеку пры прыёме на работу: "Як ставіцеся да жывёл?" Калі нейтральна, калі ласка, гэта нармальна. Я сам да сарака гадоў, пакуль служыў ва ўзброеных сілах, а потым быў заняты бізнесам, не заўважаў на вуліцах бедных жывёлінак. Але калі чалавек дрэнна ставіцца да катоў, я проста не змагу з ім працаваць.



Васіль Васільевіч прызнаўся, што сёння не ўяўляе свайго жыцця без катоў. Кажа, без іх яно было б сумным і ненапоўненым. Таму не дзіўна, што коцікі акружаюць яго не толькі на рабоце, але і дома.

— У нас дома тры каты. Жывём з жонкай у вялікай кватэры для дваіх, таму часам, калі ў «Старым кацэ» не хапае месца, бяром на перапрымку хворых жывёлінак. Ізалюем ад сваіх здаровых у асобным пакоі, клапоцімся, лечым, а потым шукаем добрыя рукі.

— У мужа каты на першым месцы, — смяецца Лізавета. — Неяк піша мне ў «Вайбер»: «Падыдзі, трэба штосьці сказаць, толькі ўваходзь асцярожна. А то ў мяне ў нагах спіць кот».

— Калі б гэта быў проста кот! А гэта кот, якога я ўзяў дамоў, каб сацыялізаваць, ён да людзей не ідзе, баіцца. Ён ужо год жыве ў мяне. Можа ляжаць у нагах, але толькі руку працягну — адразу палохаецца, уцякае. Калі яго падабралі, у яго былі зламаныя сківіца, лапа, таму нядзіўна, што ён не давярае людзям.

Трэба змалку прывіваць дзецям добрае стаўленне да жывёл. У нас быў выпадак, калі дзяўчынка падабрала на вуліцы і прынесла дадому хворае каценя. Яе мама была спачатку катэгарычна супраць. Але потым, калі ўбачыла, што дачка збірае грошы на лячэнне няшчаснага коціка, зразумела, што трэба падтрымліваць такое памкненне. У сем'ях, у якіх ёсць жывёлы, дзеці вырастуць добрымі і чулымі. Я абсалютна ў гэтым перакананы.

***— У вас ёсць мара, звязаная з катамі?***

— Мару, каб на вуліцах не было хворых і галодных катоў. Каб у нашай краіне быў прыняты закон аб абароне жывёл. Каб на заканадаўчым узроўні быў замацаваны гуманны адлоў безнаглядных катоў, каб іх не усыплялі, а прышчэплівалі ды стэрылізавалі. Каб з'явілася дзяржаўная падтрымка валанцёраў, каб ствараліся прытулкі для катоў. Каб кожны бяздомны кот рана ці позна знайшоў свайго гаспадара. Каб вёўся ўлік жывёл, было ўведзена абавязковае чыпіраванне, каб не было такога, што чалавек сёння ўзяў ката, пагуляў, а заўтра беспакарана выгнаў на вуліцу ў мароз. Думаю, што да канца свайго жыцця я буду займацца гэтай тэмай.

...Пакуль я размаўляла з Васілём і Лізаветай, у «Катавасію» прыйшла дзяўчына і прынесла пакунак лекаў для бяздомных коцікаў. Як толькі ўбачыла Яшу, расплакалася. Аказваецца, у яе нядаўна памёр гадаванец, падобны да галерэйнага ката. Крыху супакоіўшыся, дзяўчына купіла два фірменныя календары «Катавасіі» на наступны год, грошы ад продажу якіх таксама пойдуць на лячэнне хворых жывёлінак.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

**— Наступны год — Ката. Што вы ад яго чакаеце?**

— Я не веру ў гараскопы, прадказанні, — кажа Васіль Супрунюк. — У кожнага чалавека свой лёс. Але нягледзячы на тое, што ўсё развіваецца па невядомых нам законах, кожны з нас у сілах змяніць свет да лепшага. У прыватнасці, сваімі добрымі справамі.

# ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ООО «Гомельская Инжиниринговая Компания» – управляющая компания холдинга «Стройинжиниринг Групп» в лице ликвидатора извещает о проведении 24 января 2023 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **Условие продажи:** Победитель (единственный участник) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. **Местонахождение лотов № 2, №№ 4–9:** г. Гомель, ул. Малайчука, 12 | | | |
| **1** | Вагон-бытовка (инв. № 00000016). **Местонахождение:** Гомельская обл., Брагинский р-н, аг. Микуличи | 2 160,00 | **216,00** |
| **2** | Кондиционер (инв. № 00000023), кондиционер (инв. № 00000020), кондиционер GWM07AAB-K3DNA2A/1 внутр. блок и наруж. блок серии Bora Inverter (R410A) (инв. № 00000041), кондиционер GWM07AAB-K3DNA2A/1 внутр. блок и наруж. блок серии Bora Inverter (R410A) (инв. № 00000043), кондиционер GWM07AAB-K3DNA2A/1 внутр. блок и наруж. блок серии Bora Inverter (R410A) (инв. № 00000044), кондиционер GWM12QC-K6DNA10/0 наруж. блок серии Lomo Nordic Inverter (R32) (инв. № 00000042), кондиционер GWM12QC-K6DNA20/0 внутр. блок серии Lomo Nordic Inverter (R32) (инв. № 000000043), кондиционер GWM07AAB-K3DNA2A/1 внутр. блок и наруж. блок серии Bora Inverter (R410A) (инв. № б/н), кондиционер GWM07AAB-K3DNA2A/1 внутр. блок и наруж. блок серии Bora Inverter (R410A) (инв. № б/н) | 14 160,00 | **1 416,00** |
| **3** | Контейнер металлический (инв. № б/н). **Местонахождение:** Гомельская обл., г. Житковичи | 3 600,00 | **360,00** |
| **4** | Нивелир оптический BOSCH GOL 20 D (инв. № 00000014) | 240,00 | **24,00** |
| **5** | Персональный компьютер Dell Vostro Desktop 3670 (инв. № 00000050) | 1 320,00 | **132,00** |
| **6** | МФУ Canon i-Sensys MF3010 (инв. № б/н) | 840,00 | **84,00** |
| **7** | МФУ лазерное Brother DCP-L2540DNR (инв. № б/н) | 1 560,00 | **156,00** |
| **8** | Принтер Canon i-Sensys LBP623Cdw (инв. № б/н) | 1 560,00 | **156,00** |
| **9** | Принтер Epson V1120 (C11CG96405) (инв. № б/н) | 480,00 | **48,00** |

**Продавец:** Общество с ограниченной ответственностью «Гомельская Инжиниринговая Компания» – управляющая компания холдинга «Стройинжиниринг Групп», 246028, г. Гомель, ул. Малайчука, 12.

Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел. **8 (029) 611-98-91 – зам. директора Антон Александрович.**

**Шаг аукционных торгов –** 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления)**.

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 12 декабря 2022 г**. по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 20 января 2023 г. в 16.00 включительно.**

Паводле статыстыкі, калі непасрэдна зараз уся сусветная лёгкая прамысловасць перастане выпускаць новыя адзенне і абутак, таго, што ўжо пашыта, хопіць свету мінімум на паўстагоддзя. Між тым кожны год з'яўляюцца ўсё новыя і новыя модныя калекцыі, іх тыражуюць у дарагіх і танных варыянтах і развозяць па буцікаў і крамах мас-маркета, якія ў пачатку кожнага сезона вызваляюць паліцы ад нераскупленых старых калекцый для новага барахла. Гэтак ка робяць модніцы: пазбаўляюцца старога, каб накупляць новага. Але што адбываецца з гарамі адзення, якое так і не знайшло сваіх гаспадароў? Або перастала падабацца, захаваўшы пры гэтым «таварны выгляд»? Сінтэтычныя тканіны раскладаюцца стагоддзі, ды і сучасныя натуральныя — не скажаш каб хутка, фарбавальнікі выпарваюцца ў паветра, забруджваючы атмасферу. І жаданне парадаваць сябе шопінгам для некаторых пераходзіць з плоскасці матэрыяльнай у дылему маральную... Тут якраз і дапамагае рынак адзення «з рук у рукі». І эканомія, і менш шкоды для навакольнага асяроддзя. Модныя аналітыкі сцвярджаюць, што ідзе «эра сэканд-хэнду» — другаснае спажыванне ўжо ўвайшло ў моду па ўсім свеце, і гэтая мода, хутчэй за ўсё, не сыдзе скора.



Хоць па знешнім выглядзе (які, вядома ж, зманлівы, і ўсё ж...) большасць наведвальнікаў мінскага «Поля цудаў» прыехалі сюды не з высокіх маральных меркаванняў, а з жадання сэканоміць асабісты бюджэт.

### «Усё па пяць»

Тут лёгка заблукаць у часе — ствараецца поўная ілюзія, што трапіў на рэчавы рынак пачатку 1990-х. Сігналы машын рэзка гасяць фонавы гул галасоў. Тыя ж абветраныя твары і тыя ж размовы прадаўцоў:

«...Дзень пастаю, прадам — і грошы ў кішэні...»

«...Давай папрысядаем — цяплей будзе...»

Тая ж прэзентацыя тавару. Паміж радоў ходзяць «зазывалы», выкрыкваюць хрыплай скорагаворкай асартымент і цэны:

— Штаны спартыўныя, плісавыя байкі па 15 рублёў! Новы прывоз тавару!

— Джынсы мужчынскія 20 рублёў! Байкі х/б, штонікі — 15 рублёў! Плісавыя халаты асобна па 8, два па 15!

— Новенькі прывоз куртак па 25 рублёў! Сумачкі па дзясятачцы, кеды-красоўкі — таксама па 10 рублёў!

Такім чынам, цэнавы дыяпазон зразумелы адразу. Ёсць сталы, дзе ўсё па пяць, ёсць — дзе даражэй.

«За дзень надакучае горлапаніць!» — напаўголасу скардзіцца прадавец, павярнуўшыся да калегі (зразумела, ён ужывае больш энергічны дзеяслоў).

— Куртачкі, штаны і «гарналыжка» на гэтым століку па 5 рублёў. Шостая пара штаноў у падарунак, — паведамляе юны прадавец.

— Адкуль усё гэта?

— Адкуль я ведаю? У майго начальніка спытайце.

— А гэтыя рэчы неяк дэзынфіцыруюцца?

— Вядома, апрацоўваюцца заўсёды. Таму і пах такі «цікавы», — адказвае юнак.

Сапраўды, у паветры, нягледзячы на вецер, адчуваецца ўстойлівы пах санітайзера.

— Па сутнасці, гэта сэканд, толькі менш адсартаваны, — тлумачыць ён.

Даражэйшы тавар часам у кучы, часам — прыгожа раскладзены на прылаўку. Напрыклад, натуральныя футры з нейкіх дагістарычных звяроў (ад 20 да 50 рублёў) развешаныя на стойцы. Падлетак на самакаце выпадкова чапляе плячом стойку.

— Ездзяць тут! — крычыць услед прадаўшчыца, але без асаблівай злосці.

Гаспадыня прылаўка трыкатажных сукенак (адну прадаюць нават за 70 рублёў!) таксама зрабіла спробу нейкага мэрчэндайзінгу. А вось курткі навалены на фанерным стале рознакаляровай гарой. У кучы капаецца чалавек пяць наведвальнікаў. І часам выкопваюць сімпатычныя асобнікі. Мераць рэчы магчымасці няма — даводзіцца ўсё падбіраць «на вока».

— Адкуль прывозіце тавар?

— З-за мяжы, — выходзіць з «дзэну» прадавец, што дрэмле на раскладным стуле.

— З Польшчы?

— Чаму гэта? У мяне ўсё — Германія, Бельгія. Такая куртка 65 рублёў, ёсць і па 140.

— А я думала, усё па 20!

— Вунь туды ідзіце, там наогул усё па 5, — раіць дзядзечка, зноў сыходзячы ў сябе.

— Вы павесілі б прыгожа, а то здаецца, што ўсюды аднолькава...

— Каму трэба, і так купіць, — пафіласофску адказвае «будыст».

Міма гары ліфчыкаў, яшчэ больш высокай гары джынсаў і століка хатняга тэкстылю («Пледы, кілімкі, пасцельная бялізна — усё па 20, другая адзінка ў падарунак!») рухаемся далей. Увагу прыцягвае «куток байкера» — штаны і курткі рознай ступені паношанасці прадаюць па 30 рублёў за штуку.

— Так, гэта байкерская экіпіроўка — бачыце, з ахоўнымі кубкамі на каленях, — лёгка падтрымлівае размову пакупнік, які таксама вырашыў пацікавіцца. — Мяркую, у гэтым хтосьці ўжо падаў, прычым нядрэнна, — хлопец паказвае дзірку на тоўстай скуры штаноў на прылаўку.

Дрэнная прыкмета, кажу. Малады чалавек усміхаецца і паціскае плячыма.

— Новая такая экіпіроўка каштуе вельмі дорага, — тлумачыць ён. — Таму многія нашы байкеры экіпіруюцца тут.

Цэлы кут барахолкі адведзены пад дзіцячыя рэчы. Там тоўпяцца матулі, нехта — з калясачкамі. Дзеці растуць хутка, а тут «усё па пяць». Памыў — і карыстайся, а парвецца — не шкада.

### Што шукаць на «Полі цудаў»?

Часам на «Полі цудаў» з непрывабнай кучы рознакаляровых ануч можна выкапаць дастаткова якасныя рэчы і заплаціць за іх капейкі. Але капацца ў кучах «ад Гучы», як ужо гаварылася, хоча далёка не кожны. Шапагалік-радыкал здольны сысці з «Поля цудаў» са мноствам абновак, некаторыя з якіх, цалкам магчыма, нават увойдуць у лік любімых рэчаў. Грэблівы перфекцыяніст наўрад ці прымусіць сябе дакрануцца да чужых ануч, што патыхаюць дэзынфекцыяй. Але ў любым выпадку паход на «Рэчавы рынак па гандлі падтрыманымі таварамі «Поле цудаў», як афіцыйна называецца месца (аб чым паведамляе шыльда) — гэта сапраўдная прыгода. Што можна параіць, калі вы ўсё ж рашыліся на шопінг там? Не варта шукаць нешта канкрэтнае. Гэта падобна на збор грыбоў або ягад: трымайце вочы раскрытымі і глядзіце, што спадабаецца. Выбірайце ўніверсальныя базавыя рэчы — без складанага аздаблення, прэтэнцыёзных дэталяў, махроў, канцэптуальных разрэзаў, бліскавак і вышыўкі. Глядзіце на якасць: за адну і тую ж цану на «Полі цудаў» можна набыць і якасную рэч, і сапраўднае барахло. Адмоўцеся ад куплі рэчаў з любымі дэфектамі, нават невялікімі, — існуе вялікая верагоднасць, што ліквідаваць гэтыя хібы не атрымаецца. І самае галоўнае: не варта купляць, калі рашэнне вы прымаеце зыходзячы выключна з нізкай цаны тавару. Падумайце, ці сапраўды вам патрэбна гэтая рэч, хай нават за некалькі рублёў?..

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ,**
**фота аўтара.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

## РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 26 января 2023 г. проводит 2-й открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности

| Номер лота | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 12 | Перекачивающая станция горючего ПСГ-160 (130) скл. с/о 83 на ЗиЛ-130 ш. 1848926 дв. 351964 1981 г. 4 кат. 4 м/ч 1116 км | н. п. Михановичи, в/ч 52188 | 13 000,00 | 2 600,00 |
| 13 | Грузовой бортовой Урал-43202 ш. 028012 дв. 729039 1984 г. 4 кат. 105 655 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 12 400,00 | 2 480,00 |
| 14 | Грузовой бортовой Урал-4320-0011 ш. 070961 дв. 039494 1987 г. 4 кат. 102 232 км | г. Береза, в/ч 23324 | 12 000,00 | 2 400,00 |
| 15 | Грузовой бортовой КрАЗ-255Б1 ш. 590397 дв. 054344 КР-2006 г. 1987 г. 4 кат. 52 800 км | г. Береза, в/ч 23324 | 17 300,00 | 3 460,00 |
| 16 | Грузовой бортовой ГАЗ-66 ш. 0474497 дв. 223248 1986 г. 4 кат. 3106 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 6 000,00 | 1 200,00 |
| 17 | Специальный автомобиль ЗИЛ-131 с кузовом-фургоном К4-131 в составе: кузов-фургон К4-131 № 08303 1986 г. 2 кат.; автошасси ЗИЛ-131 ш. 703917 дв. 694910 1986 г. 3 кат. 1360 км | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 8 500,00 | 1 700,00 |
| 18 | Специальный автомобиль ЗИЛ-131 с кузовом-фургоном К4-131 в составе: кузов-фургон К4-131 № 050737 1983 г. 2 кат.; автошасси ЗИЛ-131 ш. 530232 дв. 858985 1983 г. 3 кат. 1034 км | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 8 500,00 | 1 700,00 |
| 19 | Специальный автомобиль ЗИЛ-131Н с кузовом-фургоном К4-131 в составе: кузов-фургон К4-131 № 04364 1989 г. 2 кат.; автошасси ЗИЛ-131Н ш. 876224 дв. 511676 1989 г. 3 кат. 2211 км | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 8 500,00 | 1 700,00 |

**Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж, 26 января 2023 г. в 10.00.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток, гарантийный депозит и подавшие заявление на участие в аукционе, соглашение, учредительные и другие необходимые документы **до 15.00 23 января 2023 г.**

Заключительная регистрация участников аукциона будет производиться **26 января 2023 г. с 9.15 до 10.00.**

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3 банковских дней с момента проведения аукциона.
2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 5 банковских дней для резидентов Республики Беларусь и 10 банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300,00 белорусских рублей за участие по каждому лоту и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»:
белорусские рубли – р/с BY12BELB30120002R20010226000,
российские рубли – р/с BY64BELB30120002R20040226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», ул. Заславская, 10, код BELBBY2X, УНП 101099370, ОКПО 37401662. Корреспондент – ПАО Сбербанк, г. Москва, № корсчета 30101810400000000225. Реквизиты банка: БИК 044525225, ИНН 7707083893, к/с в ОАО «Банк БелВЭБ» № 30111810800000000659. SWIFT/BIC: SABRRUMM. Без НДС.

Справки по тел./факсу: (017) 319-35-41, (044) 583-77-45.

Электронная почта: **auk@bsk.by.**

Извещение опубликовано на сайтах: **http://www.gki.gov.by/ru/ и https://bsk.by/.**

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б. www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | ОАО «Жлобинмебель», 247210, Гомельская обл., г. Жлобин, ул. Подъездная, 2 |

**Предмет электронных торгов: комплекс недвижимого имущества, реализуемого одним лотом,**

**Местоположение: Гомельская обл., г. Рогачев, пер. Фабричный, д. 1**

| Наименование (назначение), инв. № | Общ. площ., кв. м | Адрес (№ дома) |
|---|---|---|
| **Одноэтажное бревенчатое нежилое административное здание** (здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель), 322/С-18925 | 298,6 | 1 |
| **Одноэтажное кирпичное здание гаража** (здание специализированное автомобильного транспорта), 322/С-21584 | 197,6 | 1/4 |
| **Одноэтажное панельное здание цеха по изготовлению детской кровати** (здание нежилое), 322/С-21580 | 1179 | 1/16 |
| **Одноэтажное кирпичное здание компрессорной** (здание нежилое), 322/С-21577 | 62,8 | 1/8 |
| **Одноэтажное кирпичное здание котельной** (здание специализированное энергетики), 322/С-21576 | 599,8 | 1/15 |
| **Одноэтажный металлический навес** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), 322/С-21586 | 111,8 | 1/2 |
| **Одноэтажное кирпичное здание насосной** (здание нежилое), 322/С-21587 | 19,8 | 1/7 |
| **Двухэтажное кирпичное здание производственно-бытового корпуса** (здание нежилое), 322/С-21574 | 740,6 | 1/5 |
| **Одноэтажное кирпичное здание склада заготовок** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), 322/С-21582 | 356 | 1/1 |
| **Одноэтажное кирпичное здание склада техматериалов** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), 322/С-21575 | 391,6 | 1/10 |
| **Одноэтажное кирпичное здание столовой** (здание специализированное для общественного питания), 322/С-21578 | 196,8 | 1/11 |
| **Двухэтажное кирпичное нежилое здание трансформаторной подстанции** (здание специализированное энергетики), 322/С-21573 | 49,2 | 1/12 |
| **Одноэтажное кирпичное здание электромастерской** (здание нежилое), 322/С-21583 | 76,1 | 1/13 |

**Земельный участок** общ. пл. 2,2462 га предоставлен продавцу для строительства и обслуживания производственных зданий на праве постоянного пользования

**Начальная цена с НДС 20 % – 50 000,00 руб.**
Шаг аукциона – 5 % от текущей цены

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на счет BY92BELB 30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после электронных торгов. Продавец составляет и направляет договор победителю аукциона для подписания

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке платы за предмет аукциона, такая плата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **3 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении торгов опубликовано в газете «Звязда» от 30.11.2022 г.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 13.00 16.01.2023 г.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **13.01.2023 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 (17) 280-36-37; +375 (29) 317-95-42; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |

---

## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» (Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Борисовхлебпром» (Продавец)

Аукцион состоится **20.01.2023** в **11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

**Лот № 1, состав:**

1. Здание производственного корпуса, инв. № 620/С-33108, 1084,7 кв. м.
2. Здание проходной, инв. № 620/С-33107, 25,8 кв. м.
3. Здание гаражей, инв. № 620/С-33106, 140,8 кв. м.
4. Здание склада, инв. № 620/С-33104, 339 кв. м.

**Адрес Лота № 1: Минская обл., Дзержинский р-н, г. Дзержинск, ул. Фоминых, 1, 1Е**

Земельные участки:
1. 622250100001002286, 0,7179 га;
2. 622250100001005522, 0,0482 га.

Начальная цена с учетом НДС 20 % – 694 624,56 руб.

Задаток – 69 462,46 руб. Шаг аукциона – 5 %.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – **ino.by.**

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений и задатка – **18.01.2023 в 11.00.**

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

---

Центр Промышленной Оценки

**• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ**
**• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703. |
| **Продавец** | ОАО «Минский домостроительный комбинат», 220015, г. Минск, ул. Пономаренко, 43 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Адрес ЭТП** | www.ipmtorgi.by |

**Предмет электронных торгов:**
**Гусеничный бульдозер Caterpillar D8T**, 2009 г. в., инв. № 7418, расположенный по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 43.
**Начальная цена – 618 000 рублей с НДС.**
**Шаг торгов – 5 % от текущей цены**

**Задаток 5 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10 (десять)** рабочих дней со дня завершения электронных торгов |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов** | **10 рабочих дней** с даты заключения договора купли-продажи |

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by.
Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, штрафные санкции прописаны в соглашении о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.
Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить продавцу и организатору торгов затраты на их проведение и оплатить организатору торгов установленное вознаграждение **3 %** от цены продажи лота в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

| | |
|---|---|
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | **с 11.00 до 13.00 23.01.2023 г.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 20.01.2023 г. до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17 373-21-33; +375 (44) 704-92-06.**
**E-mail: auction@cpo.by**

---

## РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)

**информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего Дочернему унитарному предприятию «Проектный институт Гродногипрозем» республиканского унитарного предприятия «Проектный институт Белгипрозем».**

**Аукцион состоится 10.01.2023 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209.**
**Телефон для справок 55-87-71**

| Лот № 3 | |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона** | **«ДАЧИЯ ЛОГАН», регистрационный знак 0497 ВС-4, 2007 года выпуска, цвет – серебристый металлик, кузов (рама) № UU1LSDAHH37865073, разрешенная маса (кг) – 1540, пробег от начала эксплуатации в соответствии с учетными документами 325 000 км.** Условия проведения аукциона: возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца по оказанию услуг по независимой оценке транспортного средства в размере 121 руб.; возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца по уплате вознаграждения организатору торгов в размере 3 % от конечной цены продажи |
| **Начальная цена продажи** | 4 536 руб. (четыре тысячи пятьсот тридцать шесть рублей) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 453 руб. (четыреста пятьдесят три рубля) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Место, дата и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед – с 12.30 до 13.18. **Последний день приема заявлений – 06 января 2023 г. до 15.00** |

Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 21.09.2022 г.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony

# «АБЯЦАНАГА ЖЫЛЛЯ ЧАКАЮ БОЛЬШ ЯК 20 ГАДОЎ»

**Апошнім часам у рэдакцыю прыходзіць шмат пісьмаў з праблемнымі пытаннямі ад нашых чытачоў. У прыватнасці, Ганне Мікалаеўне Ждановіч з Капыля 69 гадоў. Больш як 20 з іх яна жыве ў інтэрнаце. Кажа, што ўвесь гэты час чакае паляпшэння жыллёвых умоў. «Шмат гадоў я звяртаюся ў розныя інстанцыі ў пошуках праўды і справядлівасці. Але... адны займаюцца адпіскай, другія перанакіроўваюць мае звароты, нехта пагражае, губляе дакументы, а хтосьці прапаноўвае будаваць кааператыўную кватэру ў 67 гадоў...»**

У далёкім 1983 годзе Ганне Ждановіч разам з мужам і сынам дзяржава дала двухпакаёвую кватэру па вуліцы 50 год БССР. У 1990 годзе сям'я распалася. Рашэннем суда кватэра была падзелена. Адзін пакой быў выдзелены ў карыстанне Ганне Мікалаеўне з дачкой, другі — былому мужу з сынам. «Але пасля раздзелу былы муж не пускаў мяне ў кватэру. Я двойчы звярталася ў суд аб прымусовым ўсяленні мяне ў выдзелены мне ў карыстанне пакой. Мае іскі суд задаволіў. Але, што толку, я ўсё адно так і не змагла пражываць у адной кватэры з былым мужам і яго новай жонкай...»

Ганна Мікалаеўна кажа, што неаднаразова звярталася ў райвыканкам, прасіла знайсці магчымасць размяняць тую двухпакаёўку на дзве аднапакаёвыя кватэры. «Але ніхто мне не дапамог. Больш за тое, замест таго каб паспрыяць размену, мясцовыя ўлады дазволілі былому мужу прыватызаваць пакой у спрэчнай кватэры. Страціўшы веру ў дапамогу мясцовых улад, куды я толькі ні звярталася! У выніку пасля майго звароту для разгляду пытання размену кватэры прыязджала намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу. Пасля яе прыезду ў камунальным жыллёвым фондзе Капыля знайшліся дзве аднапакаёвыя кватэры па вуліцы 50 год БССР. Але ўрэшце ключы аддалі іншаму чалавеку».

Ганна Мікалаеўна просіць напісаць, што вельмі ўдзячная былому начальніку МПМК-194, які па хадайніцтве ўпраўлення юстыцыі Мінаблвыканкама ў такі складаны для яе час выдзеліў пакой у інтэрнаце. Тым не менш усе гады, што яна жыве там, жанчына марыць пра асобнае жыллё.

«Мінаблвыканкам даў мне адказ, што я стаю на ўліку тых, хто мае патрэбу па паляпшэнні жыллёвых умоў, на агульнай чарзе з 26 красавіка 1995 года пад № 486. Хоць усе неабходныя дакументы на пастаноўку я здала ў 1991 годзе. Людзі, якія былі ў чарзе за мной, даўно паатрымлівалі кватэры. Мне ж, як у насмешку, прапанавалі ўступіць у кааператыў толькі ў 67 гадоў.

У выніку, як бачыце, я засталася без кватэры і жыву ў інтэрнаце, з якога яшчэ зусім нядаўна мяне пагражалі выселіць. Не ведаю толькі за што. Бо камунальныя плацяжы аплачваю ў поўным аб'ёме. Толькі гляньце, як яны мяне выжывалі (паказвае плацёжку). Выставілі мне рахунак за студзень — 170 рублёў. Я шмат гадоў прасіла, каб мяне прапісалі ў інтэрнат. Але ўсіх прапісваюць, а мяне не. Пажалілася знаёмай, дык яна кажа: «Мікалаеўна, хай бы ты пайшла да Качанавай на прыём». І дала мне нумар тэлефона Савета Рэспублікі. Я пазваніла, запісалася. Ну, думаю, ёсць жа праўда на свеце, і паехала ў Мінск. Расказала, што мяне не прапісваюць, што я столькі год чакаю жылля. Мяне ўважліва выслухалі і паабяцалі разабрацца ў сітуацыі. Некалькі месяцаў таму мяне ўсё ж такі прапісалі. Я так рада, што хоць з мяне перасталі выдзіраць гэтыя грошы. Цяпер зусім капейкі за пакой плачу, каля 40 рублёў.

...Як ні прыйду ў «Адно акно» спытацца, ці ёсць арэнднае жыллё, там гыркаюць. Маўляў, не можаце самі паглядзець. А я не магу, бо ў мяне няма камп'ютара, інтэрнэту. Потым усё ж жанчына паглядзела і сказала, што няма свабодных кватэр. Дык заўсёды не будзе. Я ўжо і хадзіць туды не хачу. Гэта бессэнсоўна. Яны каму хочуць, таму даюць жыллё. Боль і крыўда на такую несправядлівасць прымусіла мяне звярнуцца ў газету. На старасці гадоў хочацца пажыць па-людску, атрымаць нарэшце законнае жыллё, дзе я магла б пражываць без пагроз і якіх-небудзь перашкод. І ўнучка б да мяне прыязджала, у яе інваліднасць першай групы. А так сюды, у інтэрнат, яна не хоча ехаць, баіцца, бо раней са мной па-суседстве сям'я п'яніц жыла, яны выпівалі, буянілі, дык Маша, маленькая яшчэ тады была, спужалася моцна...»

## «З такой датай пастаноўкі на чаргу яна любую кватэру магла атрымаць»

Па каментарый я звярнулася ў Капыльскі райвыканкам. Паводле слоў **начальніка аддзела жыллёва-камунальнай гаспадаркі, архітэктуры і будаўніцтва Марыны КАНОНЧЫК,** Ганна Ждановіч стаіць на ўліку тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, у Капыльскім райвыканкаме па агульным спісе з 6 верасня 1996 года. Сёння яна сёмая па чарзе.

«На працягу шэрагу гадоў Ганне Ждановіч прапаноўваецца палепшыць жыллёвыя ўмовы з дапамогай дзяржаўнай падтрымкі шляхам будаўніцтва кватэры ў Капылі (Марына Канончык паказвае мне заведзеную на Ганну Ждановіч уліковую справу). Але ад усіх прапанаваных варыянтаў яна адмовілася. Толькі з 2006 года (я магу гаварыць толькі за той час, калі я тут працую) больш як 10 разоў прапаноўвалі ёй будаваць кааператыўную кватэру. Усім грамадзянам, якія стаяць на ўліку тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, у тым ліку і Ждановіч Ганне Мікалаеўне, высылалі заказныя пісьмы з прапановай будавацца з прыпіскай «адсутнасць з вашага боку адказу будзе лічыцца адмовай ад будаўніцтва». Вось, гляньце, паўсюль стаіць яе роспіс, які сведчыць аб тым, што чалавек атрымаў паведамленне і азнаёміўся. Але яна не звярнулася ў райвыканкам. На той час яна была ў першай дваццатцы, таму пры жаданні магла атрымаць любую кватэру, уступіць у любы кааператыў. Дасылалі ёй падобныя заказныя пісьмы ў 2006, 2007, 2008, 2009, 2010, 2014 гадах, тады ў нас адзін за адным ствараліся кааператывы.



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

**«Я шмат гадоў прасіла, каб мяне прапісалі ў інтэрнат. Але ўсіх прапісваюць, а мяне не. Пажалілася знаёмай, дык яна кажа: «Мікалаеўна, хай бы ты пайшла да Качанавай на прыём». І дала мне нумар тэлефона Савета Рэспублікі. Я пазваніла, запісалася. Ну, думаю, ёсць жа праўда на свеце, і паехала ў Мінск».**

І толькі ў 2016-м, калі будаваліся два 16-кватэрныя жылыя дамы па дзяржаўным заказе, яна адрэагавала на наша апавяшчэнне. Упершыню прыйшла ў райвыканкам і напісала заяву, што згодна набыць аднапакаёвую кватэру. Тады мы накіроўвалі яе для заключэння дагавора куплі-продажу кватэры № 10 у жылым доме па вуліцы Багдановіча, 5А ў Капылі. І яна заключыла гэты дагавор. Потым трэба было заплаціць розніцу паміж ільготна крэдытаванай плошчай і поўным коштам кватэры. Так як яна не змагла заплаціць першапачатковы ўзнос, крэдытны дагавор з банкам яна не заключыла.

У 2017, 2018, 2019 гадах мы ёй ізноў дасылалі заказныя пісьмы з прапановай будавацца, але яна іх праігнаравала. Цяпер будуецца дом у Капылі па вуліцы Партызанскай, 46. Да сённяшняга дня ў нас там неўкамплектаваныя кватэры. Калі ласка, няхай прыходзіць і піша заяву. Яна сёмая ў чарзе, таму можа прэтэндаваць на любую кватэру.

***— У 69 гадоў пабудаваць кватэру, мяркую, не так проста...***

— Пагаджуся, да 2010 года было зрабіць значна прасцей. Хоць бы таму, што ў той час ільготны крэдыт выдаваўся на ўвесь кошт кватэры на 40 год пад 3 %. Але яна чамусьці ўпусціла гэту магчымасць. Цяпер, вядома, больш складана. Сёння нават не кожная маладая сям'я можа пабудаваць кватэру, бо гэта дорага.

Але ёсць альтэрнатыва — арэнднае жыллё. У нашым раёне фонд арэнднага жылля фарміруецца з 2012 года. Ганне Мікалаеўне неаднаразова тлумачылі парадак яго выдзялення. Аднак за дзесяць гадоў яна ні разу не звярнулася з пісьмовай заявай у службу «Адно акно», каб ёй далі канкрэтную свабодную кватэру. Усю інфармацыю аб наяўным арэндным жыллі размяшчаем на афіцыйным сайце Капыльскага райвыканкама, там жа прапісваем тэрміны падачы заявы. І вось у гэтыя тэрміны яна ніколі не звяртаецца. Чамусьці яна прыходзіць на прыём ці пачынае кудысьці пісаць толькі пасля таго, як мы размяркуем кватэры, маўляў, «вось я хацела арэндную кватэру, а мне не далі». З такой датай пастаноўкі на чаргу, як у Ганны Ждановіч, яна ўжо даўно любую кватэру магла атрымаць. Я не магу растлумачыць, чаму яна дагэтуль не скарысталася сваім правам. Пры гэтым яна не адмаўляе, што шмат людзей з інтэрната атрымала такое жыллё і з'ехала. Відаць, як яна піша ва ўсіх зваротах, жанчына чакае, што ёй дадуць нейкую, калісьці некім абяцаную, бясплатную кватэру. Але з 2006 года, калі я прыйшла працаваць сюды, нікому бясплатных кватэр не выдзяляюць. Умовы атрымання жылля прапісаныя ў заканадаўстве, і яны для ўсіх аднолькавыя.

Вось літаральна днямі ў Капылі зноў вызвалілася аднапакаёвая кватэра з ліку другаснага жылля па вуліцы Партызанскай, 27-32 агульнай плошчай 17,8 кв. м. Там не ідэальныя ўмовы (жыллё калідорнага тыпу, туалет на пляцоўцы), тым не менш, людзі жывуць. Будзем размяшчаць на днях, паглядзім, звернецца ці не. (На момант здачы дадзенага матэрыялу інфармацыя вісела на сайце з пазнакай, што заявы прымаюцца службай «Адно акно» з 13 да 28 снежня 2022 года ўключна). Калі наймальнік з нейкіх прычын вызваляе арэнднае жыллё, мы адразу ж вывешваем гэтую інфармацыю на сайт. Толькі за апошнія два гады было некалькі неблагіх арэндных кватэр. У прыватнасці, па вуліцы Цеплавой (на яе было пяць прэтэндэнтаў), па вуліцы 50 год БССР (два чалавекі прэтэндавалі), на Партызанскай (тры прэтэндэнты). Калі размяркоўвалі арэнднае жыллё ў новым доме, Ганна Ждановіч таксама не звярнулася, хоць з васьмі кватэр можна было ўзяць любую. На вуліцы Замкавай была добрая кватэра, жанчына з таго ж інтэрната, дзе жыве Ганна Ждановіч, напісала заяву і пераехала туды. Варыянты перыядычна з'яўляюцца. Той, хто сапраўды хоча атрымаць арэнднае жыллё, адсочвае гэтае пытанне на сайце райвыканкама. З другасных арэндных кватэр, якія вызваляюцца, ёсць такія, якія патрабуюць рамонту (цяпер на сайце райвыканкама 6 прапаноў.) Мы шмат такіх здалі людзям, якія згаджаліся самі зрабіць рамонт. Тым больш цяпер, з выхадам новага Указа № 112, калі здаецца арэнднае жыллё, якое патрабуе рамонту, складаецца каштарыс, які зацвярджаецца ЖКГ. І калі чалавек на працягу 6 месяцаў за свае грошы робіць рамонт, то на такую суму ён у далейшым вызваляецца ад платы за арэнднае жыллё. Вось нядаўна мы на такіх умовах здалі дзве кватэры ў аграгарадках Быстрыца і Цімкавічы. Адну з іх, дарэчы, забрала грамадзянка з інтэрната, дзе пражывае Ганна Ждановіч. Яна таксама выйшла на пенсію. Кажа: «А што мяне тут чакае, у гэтым Капылі». А там неблагі дом з газавым ацяпленнем, трэба крыху падфарбаваць-падклеіць. Узялася і робіць рамонт. У першую чаргу арэнднае жыллё даецца грамадзянам, якія стаяць на ўліку тых, хто мае патрэбу, па даце пастаноўкі на ўлік. Таму Ганна Мікалаеўна, калі напіша заяву, будзе мець першачарговае права.

Нядаўна я з прадстаўнікамі Мінаблвыканкама зноў выязджала да Ганны Ждановіч, каторы раз тлумачылі ёй умовы будаўніцтва кватэры і выдзялення арэнднага жылля. Мы са свайго боку прапанавалі Ганне Мікалаеўне (і гэта пацверджана дакументальна) усе магчымыя, згодна з заканадаўствам, варыянты паляпшэння жыллёвых умоў, але яны яе не задавальняюць.

***— Растлумачце, чаму ў свой час не ўдалося задаволіць просьбу Ганны Ждановіч і размяняць двухпакаёвую кватэру, падзеленую судом?***

— Сапраўды, быў час, калі Ганна Ждановіч прасіла паспрыяць размену. У 2007 годзе ў сувязі са смерцю наймальнікаў у камунальным жыллёвым фондзе Капыля па вуліцы 50 год БССР вызваліліся дзве аднапакаёвыя кватэры. Аб гэтым мы паведамілі Ганне Мікалаеўне і яе былому мужу пісьмова. Пры іх узаемнай згодзе райвыканкам гатовы быў размяняць тую двухпакаёвую кватэру. Аднак Іван Ждановіч ад прапанаванага варыянту абмену ў пісьмовым выглядзе адмовіўся. Мы апавясцілі аб гэтым Ганну Мікалаеўну, паясніўшы, што яна мае права звярнуцца ў суд з патрабаваннем прымусовага абмену жылога памяшкання. У сувязі з гэтым мы доўгі час не размяркоўвалі тыя кватэры. Аднак жанчына не звярнулася ў суд. Выселіць з кватэры яе былога мужа ці абавязаць яго замест высялення зрабіць абмен займанага жылога памяшкання КУП «Капыльскае ЖКГ» не магло, бо Іван Ждановіч запазычанасці па жыллёва-камунальных плацяжах не меў, доказаў сістэматычнага парушэння правілаў карыстання жылым памяшканнем, якія б рабілі немагчымым пражыванне з ім у адной кватэры, у нас не было.

***— А як вы можаце пракаменціраваць сітуацыю з прапіскай?***

— Калі я ўпершыню пачула, што ў Ганны Ждановіч была нейкая праблема з прапіскай, то адразу ж пазваніла ў пашпартны стол пры ЖКГ. Там сказалі, што ніколі не было ніякіх перашкод для яе рэгістрацыі ў інтэрнаце, дзе яна пражывае. Адзінае, што ёй тлумачылі, што яна не можа быць адначасова зарэгістравана ў двух месцах. Яна ўсе гэтыя гады захоўвала за сабой пакой па вуліцы 50 год БССР, дзе і была прапісана. І толькі нядаўна, калі Ганна Ждановіч прыняла рашэнне пакінуць пакой па вуліцы 50 год БССР, яе зарэгістравалі ў інтэрнаце. Праблем ніякіх не было. Прынамсі, са слоў спецыялістаў.

Пасля таго як Ганна Мікалаеўна зарэгістравалася ў інтэрнаце, яе пакой у кватэры па вуліцы 50 год БССР перайшоў у разрад арэнднага. Мы яго выстаўлялі на сайт райвыканкама як свабодны. Яе былы муж напісаў заяву, і цяпер ён са сваёй сям'ёй з'яўляецца наймальнікам згаданага пакоя. Мы паступова стараемся адыходзіць ад так званых камуналак у фондзе арэнднага жылля, бо калі ў кватэры жыве адна сям'я, можна разлічваць на нейкі парадак.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

# Ці трэба ўтоптваць снег вакол пладовых дрэў?

**Пытанне, якое датычыцца ўшчыльнення снегу на ўчастку наогул і вакол пладовых дрэў у прыватнасці, выклікае мноства спрэчак. Адны лічаць, што ўтоптваць снег вакол пладовых дрэў трэба і гэта нібыта для іх карысна. Другія ж сцвярджаюць, што ўшчыльненне снегу вакол пладовых дрэў выкліча толькі цэлую кучу праблем.**



Старэйшае пакаленне як раней, так і цяпер, снежны пласт вакол пладовых дрэў утоптвае кожную зіму. Лічыцца, што чым больш шчыльна «ўкладзены» снег, тым каранёвая сістэма больш надзейна абаронена, шчыльны снег не дазваляе грызунам, у прыватнасці — мышам, дабрацца да смачнай кары, таму што яны нібыта не стануць паказвацца на адкрытым участку, а будуць пракопваць хады ў снезе.

Акрамя таго, шляхам ушчыльнення снегу вырашаецца пытанне забеспячэння раслін вільгаццю ў вясновы перыяд, пакольkі, як вядома, чым больш моцна ўтрамбаваны снег, тым ён павольней растае. Адпаведна, глеба пад пладовымі дрэвамі працяглы перыяд будзе вільготнай, яна, нібы ад кропельнага паліву, будзе абагачацца вільгаццю паступова, а пры рэзкім снегарастанні вялікая частка вільгаці папросту выпарыцца.

Пераходзім цяпер у лагер тых, хто ад ушчыльнення снегу ў сваіх садах адмаўляецца цалкам або часткова.

Фізіка сцвярджае, што чым снег больш друзлы, тым лепш ён трымае цяпло. Бо друзлы снег складаюць масівы сняжынак, паміж якімі запасяцца вялікія аб'ёмы паветра, што захоўваюць цеплыню ў глебе.

Акрамя таго, шмат снегу ў садзе, прычым у любым садзе, гэта заўсёды добра, гэта коўдра і падушка адначасова. Снег не дазваляе ўшчыльняцца глебаваму пласту і захоўвае ніжнюю частку ствала, а часам і першыя шкілетныя сукі ад падмярзання ў асаблівa суровыя зімы. Кожны садоўнік вам скажа, што чым больш тоўсты пласт снегу, тым на меншую глыбіню прамярзае глеба.

Тоўсты слой друзлага снегу, да ўсяго іншага, можа павысіць тэмпературу глебавага пласта і нават паскорыць адтаванне глебы і праграванне яе вясной, што немалаважна для пладовых дрэў.

Доследным шляхам устаноўлена, што таўшчыня снегу ў сантыметр павышае тэмпературу глебы прыкладна на паўградуса.

Самае цікавае, што калі вышыня снегу дасягае метра, то глеба ў садзе, насуперак усім чаканням прыхільнікаў ушчыльнення снегу вакол дрэў, будзе раставаць раней менавіта з-за розніцы тэмператур каля паверхні глебы і вышэй: ствараецца эфект патэльні, ролю якой іграе глеба. На ёй растае снег, вядома, і пад уплывам сонечных прамянёў таксама, а вось ушчыльнены снег ляжыць вельмі доўга, і пад ім глеба ледзяная — кожны можа гэта праверыць у сябе ў садзе.

Далей — мышы. Насамрэч яны спакойна перамяшчаюцца і па адкрытых участках, кіраваныя голадам, яны часам пераадольваюць яшчэ і не такія адлегласці. Тыя ж, хто лічыць, што снег можна ўшчыльніць такім чынам, што сфарміруецца штосьці падобнае на ахоўную сцяну ад мышэй, памыляюцца яшчэ больш — мышы грызуць дрэва, што для іх ваш утрамбаваны снег?

Такім чынам, калі жадаеце захаваць цяпло глебы і засцерагчы расліны, то снег ушчыльняць не варта. Калі жадаеце затрымаць максімум вільгаці на ўчастку, але адначасова на некалькі дзён, а то і на тыдзень, адцягнуць праграванне глебы, то снег на ўчастку ўтоптваць варта, асабліва гэта датычыцца яблыневых дрэў на любых прышчэпах, таму што яблыня пазней за іншых абуджаецца і якраз трапляе па часе ў насычаную вільгаццю дзякуючы ўшчыльненаму снегу і нагрэтую сонцам глебу.

Што ж датычыцца культур костачкавых, якія рана распускаюць пупышкі, то ўшчыльняць снег вакол гэтых дрэў шкодна: па-першае, яны абудзяцца ад сонца раней, чым глеба нагрэецца пад снегам, і можа пачацца банальнае ўсыханне, калі надземная маса ўжо пачынае расці і развівацца, а карані ўсё яшчэ «спяць» у халоднай глебе, пад утаптаным снегам.

Другая прычына непажаданага ўшчыльнення снежнага пласта вакол костачкавых культур датычыцца кітайскай вішні і абрыкоса, для іх лішак вільгаці вакол каранёвай шыйкі, які абавязкова з'явіцца (бо нагамі вы зробіце штосьці накшталт лункі, куды будзе сцякаць талая вада), яшчэ і небяспечны выправаннем каранёвай шыйкі.

Выснова такая — ушчыльняць снег можна ў яблыневым садзе, на пясчаных глебах, каб сабраць больш вільгаці.

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.27 | 16.49 | 7.22 |
| Віцебск — | 9.24 | 16.31 | 7.07 |
| Магілёў — | 9.17 | 16.39 | 7.22 |
| Гомель — | 9.05 | 16.45 | 7.40 |
| Гродна — | 9.40 | 17.06 | 7.26 |
| Брэст — | 9.32 | 17.14 | 7.42 |

## Месяц

*Апошняя квадра 16 снежня.*

*Месяц у сузор'і Стральца.*

## Імяніны

***Пр.** Ганны, Ефрасінні, Аляксандра, Васіля, Сцяпана, Уладзіміра.*

***К.** Ганараты, Зянона, Францішка.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

## 22 СНЕЖНЯ

У краіне

**1922** год — нарадзілася (в. Лiпнiкi Слуцкага раёна) Алена Васiлевiч, беларуская пiсьменнiца, заслужаны работнiк культуры Беларусi. Аўтар зборнiкаў апавяданняў «Падслухала сэрца», «Адно імгненне», «Шурка Рэмзікаў» і iншых. Лаўрэат Дзяржаўнай прэмii Беларусi.

**1932** год — у Вільні на аснове Цэнтральнага саюза культурных і гаспадарчых арганізацый створана Таварыства беларускай асветы, культурна-асветніцкая арганізацыя ў Заходняй Беларусі. Мэтай таварыства з'яўлялася дзейнасць па развіцці беларускай культуры, пашырэнні школьнай і пазашкольнай адукацыі на беларускай мове. Арганізацыя стварала гурткі, адкрыла 33 бібліятэкі-чытальні, арганізоўвала лекцыі, спектаклі, разгарнула выдавецкую дзейнасць. Таварыства дабілася адкрыцця беларускіх школ, умацавання ацалелых Віленскай і Навагрудскай беларускіх гімназій, выступала супраць паланізацыі, хоць і не адмаўляла супрацоўніцтва з польскімі культурна-асветніцкімі арганізацыямі, асуджала палітычныя рэпрэсіі ў БССР. У 1937 годзе дзейнасць таварыства была забаронена польскімі ўладамі.

**1942** год — 22—23 снежня адбыўся бой партызанскай брыгады «Штурмавая» па разгроме нямецка-фашысцкага гарнізона ў Лагойску, які ўвайшоў у гісторыю Вялікай Айчыннай вайны пад назвай Лагойскі бой. Гарнізон у Лагойску налічваў каля 240 гітлераўцаў. Падпольшчыкі перадалі партызанам схему ўмацаванняў праціўніка, звесткі аб размяшчэнні яго агнявых пунктаў і пастоў аховы. У выніку трохгадзіннага бою партызаны знішчылі і паранілі больш за 160 гітлераўцаў, разграмілі памяшканні паліцэйскай управы, жандармерыі і камендатуры, спалілі склады з харчаваннем і фуражом, захапілі багатыя трафеі.

**1958** год — выйшаў Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб узнагароджанні Беларускай ССР ордэнам Леніна за паспяховае аднаўленне народнай гаспадаркі і вялікія дасягненні беларускага народа ў далейшым развіцці прамысловасці, будаўніцтва, сельскай гаспадаркі і культуры.

У свеце

**1858** год — нарадзіўся Джакама Пучыні, італьянскі оперны кампазітар, арганіст і хормайстар, адзін з яркіх прадстаўнікоў кірунку «верызм» у музыцы. Некаторыя даследчыкі лічаць яго найбуйнейшым пасля Вердзі італьянскім оперным кампазітарам. Аўтар опер «Багема», «Тоска», «Мадам Батэрфляй», «Турандот» і многіх іншых.



**1919** год — са Злучаных Штатаў на параходзе «Buford» у Савецкую Расію высланыя 249 чалавек, западозраныя ў сімпатыях да бальшавікоў. Так званыя «Рэйды Палмера» — серыя сілавых акцый, прадпрынятых міністэрствам юстыцыі ЗША і іміграцыйнымі ўладамі ў 1918—1921 гадах праводзіліся пад кіраўніцтвам Генеральнага пракурора ЗША Аляксандра Палмера. З ЗША было дэпартавана больш за 500 замежных грамадзян, у тым ліку некалькіх вядомых лідараў левага руху, а таксама арыштавана больш за тры тысячы чалавек.

**1920** год — адкрыўся 8-га Усерасійскага з'езда Саветаў у Маскве, на якім, сярод іншага, быў зацверджаны план ГОЭЛРО па электрыфікацыі краіны.

Так гаварыў...

**ЦЫЦЭРОН:**

*«Няма нічога прыгажэйшага за добра апрацаванае поле».*

**ПАВАЖАНЫЯ ЎДЗЕЛЬНІКІ ПРАФСАЮЗА РАБОТНІКАЎ ТРАНСПАРТУ І КАМУНІКАЦЫЙ! ДАРАГІЯ СЯБРЫ І КАЛЕГІ!**



*Ад усёй душы віншую вас з надыходзячымі святамі —*

**НОВЫМ ГОДАМ І КАЛЯДАМІ!**

*Хачу пажадаць вам і вашым сем'ям, каб 2023 год быў напоўнены радасцю стваральнай дзейнасці і паразуменнем.*

*Дзякуй вам за вашу добрасумленную працу! Ад яе шмат у чым залежыць паспяховая жыццядзейнасць нашай краіны. Няхай надыходзячы год прынясе ўсім нам новыя мэты і дасягненні!*

**Старшыня Беларускага прафесійнага саюза работнікаў транспарту і камунікацый Мікалай МАЦЮК**

УНП 805003367

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, праспр. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 3088.

Нумар падпісаны ў 19.30 21 снежня 2022 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12